А. Р. Гуляева, М. Б. Гарбунова, І. В. Яшчэмбская-Калёса

# МУЗЫКА

3 клас



А. Р. Гуляева, М. Б. Гарбунова, І. В. Яшчэмбская-Калёса

# МУЗЫКА

Вучэбны дапаможнік для 3 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання

Для работы ў класе

*Дапушчана Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

Мінск
«Пачатковая школа»
2017

Правообладатель Пачатковая школа

УДК 78(075.2=161.3)
ББК 85.31я71
Г94

Р э ц э н з е н т:
метадычнае аб'яднанне настаўнікаў музыкі і настаўнікаў спецыяльных музычных дысцыплін і харэаграфіі Заводскага раёна г. Мінска (настаўнік музыкі вышэйшай катэгорыі дзяржаўнай установы адукацыі «Сярэдняя школа № 124 г. Мінска» *Г. С. Казачок*)

*Выкарыстаны фотаматэрыялы*
*В. Дняпроўскага, М. Несцерава і інш.*

**Гуляева, А. Р.**
Г94 Музыка : вучэб. дапам. для 3-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання : для работы ў кл. / А. Р. Гуляева, М. Б. Гарбунова, І. В. Яшчэмбская-Калёса. — Мінск : Пачатковая школа, 2017. — 168 с. : іл.

ISBN 978-985-565-369-2.

**УДК 78(075.2=161.3)**
**ББК 85.31я71**

**ISBN 978-985-565-369-2**

© Гуляева А. Р., Гарбунова М. Б., Яшчэмбская-Калёса І. В., 2017
© Афармленне. Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва "Пачатковая школа"», 2017

Правообладатель Пачатковая школа

# ДАРАГІЯ СЯБРЫ!

Нельга ўявіць жыццё без музыкі. Таму ў новым навучальным годзе мы працягнем сустрэчы з гэтым цудоўным відам мастацтва.

Вы даведаецеся, што музычная мова вельмі разнастайная. Пазнаёміцеся з песеннай, танцавальнай і маршавай музычнай мовай. Наву́чыцеся вылучаць рысы, уласцівыя песні, танцу, маршу, у буйны́х вакальных і інструментальных творах.

А хіба не цікава зазірнуць у майстэрню кампазітара і даведацца, як ствараецца музычны твор? Вы пазнаёміцеся з інтанацыяй — «зернем», з якога «вырастае» мелодыя. Навучыцеся вызначаць характар зерняў-інтанацый, паспрабуеце самастойна ствараць іх.

Назіраючы за кантрастамі і паўторамі, уласцівымі жыццю, вы зразумееце, як будуюцца музычныя творы. Некаторыя з музычных форм вы зможаце выкарыстаць ва ўласнай творчасці.

Вас чакаюць новыя сустрэчы з музыкай выдатных кампазітараў: П. Чайкоўскага, М. Глінкі, М. Рымскага-Корсакава, Э. Грыга, Ф. Шапэна, Ф. Шуберта, а таксама з цудоўным светам беларускага музычнага мастацтва.


Правообладатель Пачатковая школа

Каб з падручнікам было лёгка і зручна працаваць, запомніце ўмоўныя абазначэнні:



— паслухайце музычны твор;



— праспявайце песню альбо выканайце мелодыю на музычным інструменце;




— выразна прачытайце літаратурны твор;



— перадайце ўражанні ад музыкі сродкамі выяўленчага мастацтва;



— перадайце ўражанні ад музыкі выразнымі рухамі.



Правообладатель Пачатковая школа

## Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь

Словы М. Клімковіча,
У. Карызны

Музыка Н. Сакалоўскага






Правообладатель Пачатковая школа






Правообладатель Пачатковая школа

Мы, беларусы — мірныя людзі,
Сэрцам адданыя роднай зямлі,
Шчыра сябруем, сілы гартуем
Мы ў працавітай, вольнай сям'і.

Слаўся, зямлі нашай светлае імя,
Слаўся, народаў братэрскі саюз!
Наша любімая маці-Радзіма,
Вечна жыві і квітней, Беларусь!

Разам з братамі мужна вякамі
Мы баранілі родны парог,
У бітвах за волю, бітвах за долю
Свой здабывалі сцяг перамог!

Слаўся, зямлі нашай светлае імя,
Слаўся, народаў братэрскі саюз!
Наша любімая маці-Радзіма,
Вечна жыві і квітней, Беларусь!

Дружба народаў — сіла народаў —
Наш запаветны, сонечны шлях.
Горда ж узвіся ў ясныя высі,
Сцяг пераможны — радасці сцяг!

Слаўся, зямлі нашай светлае імя,
Слаўся, народаў братэрскі саюз!
Наша любімая маці-Радзіма,
Вечна жыві і квітней, Беларусь!


Правообладатель Пачатковая школа

# ПЕСЕННЫ, ТАНЦАВАЛЬНЫ І МАРШАВЫ ХАРАКТАР МУЗЫЧНАЙ МОВЫ

## ПЕСЕННЫ, ТАНЦАВАЛЬНЫ І МАРШАВЫ ХАРАКТАР МУЗЫЧНАЙ МОВЫ

Вам ужо знаёмыя песня, танец і марш — тры «кіты» ў музыцы. Кожны з іх мае свае адметныя рысы.



### Во поле берёза стояла

Руская народная песня






Гэтай песні ўласцівы паступенны рух мелодыі, павольны тэмп, роўны рытм.



Правообладатель Пачатковая школа

## Полька

*(з «Дзіцячага альбома»)*

Музыка П. Чайкоўскага



Для танца характэрна скачкападобная мелодыя, адчуванне падскокаў, прытупаў альбо кружэння.

## Марш драўляных салдацікаў

*(з «Дзіцячага альбома»)*

Музыка П. Чайкоўскага



Марш лёгка пазнаць па адчуванні крокаў.



Правообладатель Пачатковая школа

Рысы, уласцівыя песні, танцу і маршу, можна вылучыць і ў буйных музычных творах. Мы можам адчуць песеннасць, танцавальнасць і маршавасць, калі слухаем оперу, балет, сімфонію альбо канцэрт.

Песенны, танцавальны і маршавы характар музыкі можна разглядаць як своеасаблівыя знакі душэўнага стану чалавека.

Як вызначыць песеннасць, танцавальнасць і маршавасць у музыцы?

**Песеннасць — у музыцы адчуваюцца адметныя рысы песні.**

**Танцавальнасць — у музыцы адчуваюцца адметныя рысы танца.**

**Маршавасць — у музыцы адчуваюцца адметныя рысы марша.**

У 2 класе вы ўжо знаёміліся з музыкай, якая мае песенны, танцавальны альбо маршавы характар. Прыгадаем адпаведныя творы.



Правообладатель Пачатковая школа

Песенны характар музычнай мовы:



**Адажыа
Маленькага прынца
і Ружы**
*(з балета
«Маленькі прынц»)*
Музыка Я. Глебава

Танцавальны характар музычнай мовы:



**Тема Болтушки**
*(з оперы
«Воўк і сямёра казлянят»)*
Словы Я. Манучаравай
Музыка М. Каваля

Маршавы характар музычнай мовы:



**Пеця**
*(з сімфанічнай казкі
«Пеця і воўк»)*
Музыка С. Пракоф’ева


Правообладатель Пачатковая школа



**Аліна Іванаўна Безенсон**
(нарадзілася ў 1971 г.)

**Аліна Безенсон** — сучасны беларускі кампазітар.

Цяжка знайсці інструмент альбо выканальніцкі састаў, які застаўся па-за ўвагай гэтага кампазітара. А. Безенсон стварае музыку для аркестра, хору, ансамбляў, асобных інструментаў. Сярод найбольш любімых яе інструментаў — домра, на якой яна вучылася граць у дзяцінстве, і цымбалы.

Асаблівае месца ў творчасці А. Безенсон займае музыка для юных выканаўцаў.



## Жывіца

Словы Т. Мушынскай — Музыка А. Безенсон






Правообладатель Пачатковая школа






Правообладатель Пачатковая школа




2. Кроплі ягад між купін балот,
журавінаў і яркіх брусніцаў.
У спрадвечным трымценні чарот.
Песню гэтую чуюць сініцы.

**Прыпеў.**

3. Ходзіць вецер нястомны між дрэў,
беларускую песню спявае.
Урачысты, магутны напеў
згадкі лепшыя нам навявае.

**Прыпеў.**

1. Паслухайце песню. Пра што распавядаецца ў запеве, пра што — у прыпеве?
2. Вызначце характар музычнай мовы запеву і прыпеву. Падбярыце словы, якія адпавядаюць характару музыкі ў запеве і прыпеве.
3. Праспявайце песню. Падбярыце да прыпеву выразныя рухі і ўпрыгожце імі выкананне.


Правообладатель Пачатковая школа

## ПЕСЕННЫ ХАРАКТАР МУЗЫЧНАЙ МОВЫ

Вакальная музыка — гэта музыка, прызначаная для спеваў.

Вакальную музыку можа выконваць адзін спявак — саліст, некалькі спевакоў — ансамбль, цэлы калектыў — хор. Вакальныя творы могуць выконвацца з інструментальным суправаджэннем альбо без яго.

Большасць вакальных твораў цесна звязана са словам. Таму мы кажам, што ў іх спалучаюцца музыка і паэзія.

Песня адносіцца да вакальнай музыкі.

Песеннаму характару музычнай мовы ўласцівы паступенны, плаўны рух мелодыі, павольны тэмп, роўны рытм.

### Дуб

Распусціўшы сучча
у глухім прыволлі,
сам адзін расце ён
на далёкім полі.

Як цар, у кароне,
аб нічым не дбае,
ці то стогне бура,
ці віхор гуляе.

На адным ён месцы
днюе і начуе;
многа казак знае,
многа песень чуе.

Дождж падмыў карэнне;
ў ім дупло — як хата...
Ён стаіць і дрэмле —
грозны, расахаты.

*Я. Купала*



Правообладатель Пачатковая школа

1. Якая карціна паўстае перад вамі падчас чытання верша?

2. Разгледзьце карціну Апалінарыя Гараўскага. Што аб'ядноўвае верш і карціну? Чым яны адрозніваюцца?



А. Гараўскі. «Вечар у Мінскай губерні»

3. Знайдзіце ў вершы Янкі Купалы радкі, якія адпавядаюць настрою карціны. Зачытайце.



Правообладатель Пачатковая школа



**Алег Міхайлавіч Чыркун**
(нарадзіўся ў 1942 г.)

**Алег Чыркун** — сучасны беларускі кампазітар, які плённа працуе ў розных музычных жанрах. Ён аўтар аперэты «Калі заспявае певень», дзіцячых опер, музыкі да кінафільмаў і спектакляў. Але галоўнае месца ў творчасці А. Чыркуна займаюць песні. Ім створана каля трохсот песень. Меладычныя і пранікнёныя, яны надзвычай папулярныя сярод выканаўцаў і слухачоў.

## Дуб

Словы Я. Купалы — Музыка А. Чыркуна






Правообладатель Пачатковая школа






Правообладатель Пачатковая школа

**1.** Паслухайце песню. Якія сродкі музычнай выразнасці выкарыстаў кампазітар?

**2.** Паназірайце за рухам мелодыі. Карыстайцеся графічнымі схемамі.




**3.** Кампазітар пабудаваў свой твор на аснове двух рытмічных малюнкаў. Выканайце іх.







Прачытайце словы песні згодна з рытмічнымі малюнкамі.



Правообладатель Пачатковая школа

4. Праспявайце песню. У час выканання перадайце настрой музыкі.

5. Паспрабуйце разам з настаўнікам стварыць мелодыю песеннага характару. Запішыце яе ў сшытку альбо на дошцы.

Кампазітары часта выкарыстоўваюць мелодыі песеннага характару ў буйных творах. Плаўная, напеўная мелодыя, роўны рытм найлепш падыходзяць для перадачы задуменнасці і спакою.



**Дзмітрый Вітальевіч Лыбін**
(нарадзіўся ў 1963 г.)

**Дзмітрый Лыбін** — сучасны беларускі кампазітар. Сярод яго твораў — «Дом з прывідам», «Музыка для горада Нясвіжа», «Арнамент Полацкага храма», «Дзіцячы сшытак», «З зімовых вечароў на Палессі». Адзін з найбольш прыгожых твораў — «Правінцыяльная сімфонія» для струннага аркестра.



Правообладатель Пачатковая школа

# Правінцыяльная сімфонія

*(урывак з 3-й часткі)*

Музыка Д. Лыбіна

1. Слова «правінцыя» абазначае мясцовасць, аддаленую ад буйных гарадоў. Угледзьцеся ў правінцыяльны пейзаж. Вызначце яго асаблівасці. Як можна апісаць правінцыяльны пейзаж?



2. Як вы лічыце, што імкнуўся перадаць кампазітар у сваім творы? Што вы ўяўляеце падчас слухання?





Правообладатель Пачатковая школа

3. Вызначце характар музычнай мовы. Праспявайце галоўную мелодыю твора.

4. Перадайце малюнак мелодыі выразнымі рухамі рук. Замалюйце яго ў сшытку альбо на дошцы.



## ПЕСЕННАСЦЬ У ІНСТРУМЕНТАЛЬНАЙ МУЗЫЦЫ

Інструментальная музыка выконваецца на музычных інструментах.



**Пётр Ільіч Чайкоўскі**
(1840–1893)

**Пётр Чайкоўскі** — сусветна вядомы рускі кампазітар. Яго музыка адлюстроўвае свет чалавечых пачуццяў. Яна вылучаецца пранікнёнасцю і меладыйнасцю. Найбольшую папулярнасць набылі оперы П. Чайкоўскага «Пікавая дама», «Яўген Анегін», «Іаланта», балеты «Спячая прыгажуня», «Лебядзінае возера», «Шчаўкунок», а таксама сімфоніі.



Правообладатель Пачатковая школа

Цыкл фартэпіянных п’ес «Дзіцячы альбом» П. Чайкоўскі прысвяціў свайму пляменніку Валодзю Давыдаву, які вельмі любіў музыку. У «Дзіцячым альбоме» адлюстраваны карціны жыцця маленькага чалавека — «Ранішняя малітва», «Новая лялька», «Гульня ў конікі» і інш.

Многія кампазітары стваралі інструментальныя п’есы, падобныя на песні. Гэтыя творы так і называюцца — «песня», альбо «песенька». У цыкле фартэпіянных п’ес «Дзіцячы альбом» П. Чайкоўскага ёсць некалькі такіх песенек — нямецкая, італьянская... А найбольш вядомая — «Старадаўняя французская песенька».



## Старадаўняя французская песенька

*(з «Дзіцячага альбома»)*

Музыка П. Чайкоўскага






Правообладатель Пачатковая школа





Правообладатель Пачатковая школа

1. Уважліва паслухайце твор. Які характар музычнай мовы яму ўласцівы? Якія сродкі музычнай выразнасці выкарыстаў кампазітар?
2. Паспрабуйце перадаць малюнак мелодыі пры дапамозе выразных рухаў. Плаўныя ці адрывістыя рухі вам спатрэбіліся? Чаму?
3. Прачытайце, што напісаў пра «Старадаўнюю французскую песеньку» ўкраінскі пісьменнік Анатоль Харунжы: «Гэта была павольная, нейкая задуменная, трохі сумная песня. Яна вымушала нават самых вясёлых замоўкнуць, задумацца». Ці згодны вы з ім?
4. Мелодыя «Старадаўняй французскай песенькі» вельмі прыдатная для спеваў. Развучыце песеньку са словамі Эмы Аляксандравай. Спявайце мякка, плаўна.

Под вечер над рекой
прохлада и покой.
Белея, облака уходят
вдаль грядой.
Стремятся, но куда?
Струятся, как вода,
летят, как стая птиц,
и тают без следа.


Правообладатель Пачатковая школа

Вы ўжо ведаеце, што ў балеце пануе танец. Аднак нават у гэтым буйным творы можна сустрэць музыку песеннага характару.

## Дуэт Машы і Прынца

*(з балета «Шчаўкунок»)*

Музыка П. Чайкоўскага



1. Дуэт Машы і Прынца — гэта гімн каханню. Пры дапамозе якіх сродкаў музычнай выразнасці кампазітар перадаў гэта пачуццё?
2. Праспявайце мелодыю альбо выканайце яе на музычным інструменце.
3. Перадайце малюнак мелодыі выразнымі рухамі рук. Адлюструйце яго ў сшытку альбо на дошцы.



Правообладатель Пачатковая школа

# ТАНЦАВАЛЬНЫ ХАРАКТАР МУЗЫЧНАЙ МОВЫ

Танцавальная музыка вельмі разнастайная. Кожны танец мае своеасаблівы пульс. Калі мы слухаем альбо граем польку, звычайна лічым «раз, два». Калі гучыць вальс, мы лічым «раз, два, тры».

Мелодыя ў вальсе быццам кружыцца, а ў мелодыі полькі адчуваюцца падскокі. У іншых танцах можна адчуць прытупванні альбо паклоны.

Бельгійскі паэт Марыс Карэм напісаў верш, у якім «намаляваў» карціну вясёлага, хуткага танца. На беларускую мову верш пераклала паэтка Эдзі Агняцвет.

## Тра-ля-ля-ля-ля

Уваходзьце ў круг!
Тра-ля-ля!
Круглая зямля!
Каб шпарчэй круціцца,
яблыку кругламу каціцца,
водзяць карагод,
каб скакаў народ.
Патанцуем!
Патанцуем?

Патанцуем так!
Раз і два у такт
круціцца вятрак!
Пачынай круціцца!
Скача ў такт пшаніца,
скача сонца ў полі,
больш запалу, болей!
Карагод гуляе
і людзей яднае.



Правообладатель Пачатковая школа

1. Ці можам мы сказаць, што гэтаму вершу ўласцівы рысы танцавальнасці? Чаму?
2. Знайдзіце радкі, у якіх адчуваецца кружэнне; падскокі; прытупванні.
3. Выразна прачытайце верш. Перадайце пры чытанні, як карагод паскарае альбо запавольвае свой рух.

Адметнай асаблівасцю беларускай народнай музыкі з'яўляюцца песні-танцы. У іх спалучаюцца танцавальныя рухі і спевы. Звычайна песні-танцы маюць вясёлы, гарэзны характар. Іх назвы часта супадаюць з назвамі адпаведных танцаў.







## Мікіта

Беларуская народная
песня-танец






Правообладатель Пачатковая школа




1. Праспявайце песню. Які характар музычнай мовы ёй уласцівы? Дзе ў песні адчуваюцца прытупванні і падскокі?
2. Стварыце графічную мадэль мелодыі прыпеву. Замалюйце яе ў сшытку альбо на дошцы.
3. Прыдумайце да песні выразныя танцавальныя рухі. Які танец яны нагадваюць?



**Яўген Аляксандравіч Глебаў**
(1929–2000)

**Яўген Глебаў** — беларускі кампазітар, вядомы далёка за межамі нашай краіны. Сярод напісаных ім твораў — балеты «Тыль Уленшпігель», «Маленькі прынц», «Альпійская балада». Шырокую папулярнасць набыла яго музыка да кінафільма «Дзікае паляванне караля Стаха».


Правообладатель Пачатковая школа

Араторыя «Запрашэнне ў краіну маленства» створана кампазітарам для юных выканаўцаў і слухачоў.

**Араторыя** — буйны твор для салістаў, хору і аркестра. У араторыі спалучаюцца вакальная і інструментальная музыка.

Араторыя звычайна выконваецца на канцэртнай пляцоўцы, аднак — у адрозненне ад оперы ці балета — без дэкарацый і сцэнічнага дзеяння.

Араторыя заўсёды складаецца з некалькіх частак. Паміж яе часткамі часам выконваюцца інтэрмедыі — невялікія інструментальныя п’есы.

«Заўжды ляці» — заключная частка араторыі «Запрашэнне ў краіну маленства».

## Заўжды ляці

*(з араторыі «Запрашэнне ў краіну маленства»)*

Словы П. Макаля — Музыка Я. Глебава

1. Вызначце галоўную думку твора. Як вы разумееце словы «краіна маленства адкрыта заўжды»?
2. Што надае музыцы танцавальны характар? Які танец яна нагадвае?
3. Прыдумайце выразныя рухі, якія падыходзяць да характару музыкі. Падчас паўторнага слухання свабодна дырыжыруйце творам.



Правообладатель Пачатковая школа

# ТАНЦАВАЛЬНАСЦЬ У ВАКАЛЬНАЙ І ІНСТРУМЕНТАЛЬНАЙ МУЗЫЦЫ

Рысы танцавальнасці ўласцівы многім музычным творам. Часам танцавальнасць адчуваецца і ў песнях.

## Лесной праздник

Словы А. Фаткіна Музыка Ж. Металідзі








Правообладатель Пачатковая школа




1. Уважліва паслухайце песню. Які характар музычнай мовы ёй уласцівы?
2. Што адчуваецца ў музыцы: кружэнне, падскокі ці прытупванні? Які танец яна нагадвае?
3. Праспявайце песню. Прыдумайце да яе выразныя танцавальныя рухі. Упрыгожце імі выкананне.



**Галіна Канстанцінаўна Гарэлава**
(нарадзілася ў 1951 г.)

**Галіна Гарэлава** — сучасны беларускі кампазітар. Значнае месца ў яе творчасці займае жанр інструмен-


Правообладатель Пачатковая школа

тальнага канцэрта. У творчай скарбонцы Г. Гарэлавай восем канцэртаў для розных інструментаў: скрыпкі, габоя, балалайкі, гітары, трубы, трамбона, альта і дзвюх труб.

Пазнаёмцеся з п’есай Г. Гарэлавай «Папяровая балерына».





## Папяровая балерына



Музыка Г. Гарэлавай




1. Уважліва паслухайце твор. Вызначце ўласцівы яму характар музычнай мовы.
2. Што адчуваецца ў музыцы: падскокі, прытупванні ці кружэнне? Які танец выконвае папяровая балерына?
3. Перадайце малюнак мелодыі выразнымі рухамі рук. На што ён падобны? Замалюйце яго ў сшытку альбо на дошцы.



Правообладатель Пачатковая школа

З танцавальнай музыкай мы можам сустрэцца і ў буйных музычных творах.



**Міхаіл Іванавіч Глінка**
(1804–1857)

**Міхаіл Глінка** — стваральнік рускай прафесійнай музыкі. Яго творчай манеры ўласцівы выразныя мелодыі і разнастайныя аркестравыя фарбы. Шырока вядомы яго оперы «Іван Сусанін», «Руслан і Людміла», сімфанічныя ўверцюры «Камарынская», «Ноч у Мадрыдзе», «Вальс-фантазія».

Падчас вандроўкі кампазітара па Іспаніі яго ўразіла тэмпераментнае выкананне хоты. Свае ўражанні ён увасобіў у сімфанічнай уверцюры «Арагонская хота».

Слова «ўверцюра» ў перакладзе з французскай мовы значыць «адкрыццё». Спачатку ўверцюрай называлі ўступ да оперы, які выконваўся сімфанічным аркестрам. Пазней кампазітары пачалі



Правообладатель Пачатковая школа

ствараць канцэртныя ўверцюры, якія не былі часткай оперы альбо балета.

Вось як распавядаў пра стварэнне «Арагонскай хоты» М. Глінка: «В первой половине сентября отправились в Мадрид. По-прежнему продолжал я изучать испанский язык и испанскую музыку. Вскоре по приезде в Мадрид я принялся за «Хоту». Окончив её, я внимательно изучал напевы простолюдинов. Хаживал ко мне один погонщик мулов и пел народные песни, которыя я старался уловить и положить на ноты».

**Хота** — іспанскі танец. Яго ўзнікненне звязана з іспанскай правінцыяй Арагон. Хоце ўласцівы трохдольны пульс і актыўны характар. Танцуюць яе ў парах. Танец суправаджаецца гучаннем ударных інструментаў — кастаньетаў.

**Кастаньеты** — ударны інструмент, які ўяўляе сабой пласцінкі-ракавінкі, счэпленыя скураным шнурком.





Правообладатель Пачатковая школа



Т. Стражбецкая. «Арагонская хота. Іспанскі танец»

## Арагонская хота

Музыка М. Глінкі






Правообладатель Пачатковая школа



1. Які настрой выклікала ў вас музыка? Як вы лічыце, што надае музыцы танцавальны характар?
2. Якую ролю адыгрывае сімфанічны аркестр у стварэнні яскравай карціны танца?
3. Стварыце рытмічны акампанемент да твора. Запішыце яго ў сшытку альбо на дошцы. Дадайце рытмічны акампанемент да паўторнага слухання «Арагонскай хоты». Сачыце, каб ён не быў больш моцны, чым гучанне аркестра.

## МАРШАВЫ ХАРАКТАР МУЗЫЧНАЙ МОВЫ

Звычайна мы беспамылкова можам пазнаць музыку маршавага характару, нават калі чуем музычны твор упершыню. Маршавай музыцы ўласцівы адчуванне крокаў, шэсця, пругкасць рытму.


Правообладатель Пачатковая школа

У маршавай музыцы часта сустракаецца пункцірны рытм.

**Пункцірны рытм** — гэта спалучэнне падоўжаных і скарочаных доляй пульсу.

Звярніце ўвагу на тое, як перадаецца пункцірны рытм у нотным запісе.



Маршавасць можна адчуць і ў вершах. Адчуванне крокаў у вершы надае яму маршавы характар.

## Ёжик и барабан



С барабаном ходит ёжик,
бум-бум-бум!
Целый день играет ёжик,
бум-бум-бум!



Правообладатель Пачатковая школа

С барабаном за плечами,
бум-бум-бум!
Ёжик в сад забрёл случайно,
бум-бум-бум!
Очень яблоки любил он,
бум-бум-бум!
Барабан в саду забыл он,
бум-бум-бум!
Ночью яблоки срывались,
бум-бум-бум!
И удары раздавались,
бум-бум-бум!
Зайцы здорово струхнули,
бум-бум-бум!
Глаз до зорьки не сомкнули,
бум-бум-бум!

*Г. Віеру (пераклад Я. Акіма)*

1. Выразна прачытайце верш. Стварыце да яго рытмічны акампанемент. Запішыце яго ў сшытку альбо на дошцы.
2. Прачытайце верш уголас, суправаджаючы чытанне рытмічным акампанементам.

Многія музычныя творы маюць маршавы характар. Слухаючы іх, мы можам адчуць шэсце альбо крокі.


Правообладатель Пачатковая школа



## Генрых Мáтусавіч Вагнер
(1922–2000)

**Генрых Вагнер** — вядомы беларускі кампазітар і піяніст. Сярод яго твораў — опера «Сцежкаю жыцця», вакальна-сімфанічная паэма «Вечна жывыя», балеты «Святло і цені», «Пасля балю», сімфоніі, музыка да спектакляў і кінафільмаў.

Аднаму са сваіх твораў Г. Вагнер даў назву «Крокі».

### Крокі

Музыка Г. Вагнера



**1.** Уважліва паслухайце твор. Дзе ў ім адчуваюцца крокі? Праспявайце «музычныя крокі» альбо выканайце іх на інструменце.



Правообладатель Пачатковая школа

**2.** Перадайце набліжэнне і аддаленне крокаў. Як вы думаеце, чаму кампазітар на працягу твора змяняе сілу гуку?



**3.** Прыдумайце невялікае апавяданне паводле твора Генрыха Вагнера. Сачыце, каб сюжэт адпавядаў развіццю музыкі.



Правообладатель Пачатковая школа

Часам маршавасць можна адчуць і ў песні.

## Песенка слонёнка о самом себе

Словы А. Зарубіна Музыка А. Даньшовай








Правообладатель Пачатковая школа





Правообладатель Пачатковая школа




1. Што надае музыцы маршавы характар? Як маршавасць перадаецца ў нотным запісе?
2. Праспявайце песню. Перадайце ў выкананні пругкасць рытму, адчуванне крокаў.
3. Падбярыце інструменты для рытмічнага акампанементу. Упрыгожце ім выкананне песні.



Рытмічны акампанемент
да «Песенки слонёнка о самом себе»


Правообладатель Пачатковая школа

# МАРШАВАСЦЬ У ВАКАЛЬНАЙ І ІНСТРУМЕНТАЛЬНАЙ МУЗЫЦЫ

Маршавая музыка дапамагае кампазітарам адлюстроўваць разнастайныя карціны жыцця.



**Алег Барысавіч Залётнеў**
(нарадзіўся ў 1947 г.)

**Алег Залётнеў** — сучасны беларускі кампазітар. Аўтар шматлікіх твораў, сярод якіх оперы, канцэрты для розных інструментаў, сімфонія, араторыя, кантата, балет і інш. Стварыў музыку да 90 спектакляў, 35 кіна- і тэлефільмаў.

Для маленькіх выканаўцаў і слухачоў кампазітар напісаў оперу «Адчыніце, казляняткі». Яна заснавана на вядомым усім казачным сюжэце.

Адна з дзейных асоб оперы — руплівы і працавіты Каваль. Менавіта ён дапамагае Казе з казлянятамі перамагчы Ваўка.


Правообладатель Пачатковая школа

# Песенька Каваля

*(з оперы «Адчыніце, казлянаткі»)*

Словы П. Макаля | Музыка А. Залётнева








Правообладатель Пачатковая школа




1. Ці можна назваць гэты твор музычным партрэтам Каваля? Якія рысы характару героя перадаў кампазітар пры дапамозе музыкі?
2. Праспявайце песеньку. Ці аднолькавы характар музычнай мовы ў першай і апошняй частках твора і яго сярэдзіне?
3. Выканайце рытмічны акампанемент пры дапамозе пляскання ў далоні, пастуквання. Упрыгожце ім выкананне першай і апошняй частак песенькі.



Рытмічны акампанемент да «Песенькі Каваля»


Правообладатель Пачатковая школа



**Фрыдэрык Шапэн**
(1810–1849)

**Фрыдэрык Шапэн** — выдатны польскі кампазітар. Большасць музычнай спадчыны Ф. Шапэна складаюць творы для фартэпіяна.

У юнацкія гады Ф. Шапэн быў вымушаны пакінуць радзіму. Усё астатняе жыццё ён правёў у выгнанні.

У сваёй творчасці Ф. Шапэн шырока выкарыстоўваў рысы, уласцівыя польскай народнай музыцы. Ён увёў у сусветную музычную культуру польскія танцы — паланэз і мазурку.

**Паланэз** — старадаўні танец-шэсце, які мае польскае паходжанне. Слова «паланэз» у перакладзе з французскай мовы і значыць «польскі».

Паланэзу ўласцівы ўрачысты, велічны характар. Гэты танец выконваецца ў парах. У мінулыя часы з выканання паланэза пачыналіся балі.



Правообладатель Пачатковая школа

## Паланэз

Музыка Ф. Шапэна



1. Што надае музыцы характар шэсця?
2. Выканайце пульс музыкі. Што ў ім незвычайнага? Чым пульс паланэза адрозніваецца ад пульсу марша?

Кампазітары часта спалучаюць розныя характары музычнай мовы ў адным творы. Рысы, уласцівыя песні, танцу і маршу, можна вылучыць у оперы, сімфоніі, балеце, іншых буйных музычных творах.



Правообладатель Пачатковая школа



## Першая інтэрмедыя

*(з араторыі «Запрашэнне ў краіну маленства»)*

Музыка Я. Глебава




1. Колькі частак у інтэрмедыі? Які характар музычнай мовы ўласцівы кожнай з іх? Які беларускі народны танец нагадвае мелодыя інтэрмедыі?
2. Што вы ўяўляеце, слухаючы гэту музыку? Прыдумайце невялікае апавяданне да інтэрмедыі. Прасачыце, каб развіццё сюжэта адпавядала развіццю музыкі.



Правообладатель Пачатковая школа

## АБАГУЛЬНЕННЕ ТЭМЫ ПЕРШАЙ ЧВЭРЦІ

1. Пра што могуць распавесці творы песеннага, танцавальнага і маршавага характару?
2. Якія асаблівасці песеннай музыкі вы ведаеце? Прывядзіце прыклады вакальных і інструментальных твораў, якія вылучаюцца песенным характарам музычнай мовы.
3. Згадайце характэрныя рысы танцавальнай музычнай мовы. У якіх вакальных і інструментальных творах яна вам сустрэлася?
4. Што ўласціва маршавай музычнай мове? Якім знаёмым вам вакальным і інструментальным творам уласцівы рысы маршавасці?
5. Песеннасць, танцавальнасць і маршавасць часам сустракаюцца ў адным творы. Паразважайце, для чаго кампазітары спалучаюць іх у сваёй музыцы.
6. Паспрабуйце вызначыць характар музычнай мовы не вядомага вам твора па нотным запісе. На што вы будзеце звяртаць увагу перш за ўсё?
7. Стварыце рытмічны акампанемент да музычнага твора, які найбольш вам падабаецца.
8. Падбярыце з музыкі, якая гучала на ўроках, творы для сваёй музычнай калекцыі.


Правообладатель Пачатковая школа

# ІНТАНАЦЫЯ

## ВЫРАЗНАСЦЬ СЛОВА, ГУКУ, РУХУ

Інтанацыя перадае пачуцці чалавека. Яна ўласціва маўленню, рухам, музыцы.

Любое слова можна вымавіць з рознай інтанацыяй. Мы разумеем інтанацыі, нават калі чуем гаворку на незнаёмай мове. Нягледзячы на незразумеласць слоў, мы лёгка пазнаём выразныя інтанацыі здзіўлення, пытання, абурэння.



### Разговор с пчелой



Меня ужалила пчела.
Я закричал: «Как ты могла?!»
Пчела в ответ:
«А как ты мог
сорвать любимый мой цветок?
Ведь он мне был ужасно нуж-жен:
я берегла его на уж-жин!»

*М. Барадзіцкая*

**1.** Якія пачуцці герояў перададзены ў вершы?



Правообладатель Пачатковая школа

**2.** Пры чытанні верша звярніце ўвагу на выразнасць маўленчай інтанацыі. Упрыгожце чытанне выразнымі рухамі.

**Музычная інтанацыя** з дапамогай гукаў перадае і чалавечыя пачуцці, і карціны навакольнага свету.



**Мікалай Андрэевіч Рымскі-Корсакаў**
(1844–1908)

**Мікалай Рымскі-Корсакаў** — выдатны рускі кампазітар. Яго музыка цесна звязана з рускай казкай, народным побытам, карцінамі прыроды. Ён дасканала валодаў аркестравым пісьмом. Аркестр у яго творах — сапраўдная палітра выразных і выяўленчых фарбаў.

М. Рымскі-Корсакаў стварыў 15 опер. Опера «Казка пра цара Салтана» напісана на сюжэт вядомай казкі А. Пушкіна.



### Палёт чмяля

*(з оперы «Казка пра цара Салтана»)*

Музыка М. Рымскага-Корсакава



Правообладатель Пачатковая школа

1. Што вы ўявілі падчас гучання музыкі?

2. Як вы лічыце, чаму кампазітар скарыстаўся кароткімі працягласцямі, хуткім тэмпам? Тэмбры якіх інструментаў добра чуваць у аркестры? Як кампазітар перадае набліжэнне і аддаленне чмяля?

Ад таго, якія фарбы выкарыстаў мастак, пэўным чынам залежыць выразнасць мастацкага вобраза. Калі мы гаворым пра выразныя магчымасці колеру, то ўжываем слова «каларыт».



І. Айвазоўскі.
«Марскі праліў з маяком»



І. Айвазоўскі.
«Бура на моры ноччу»

Разгледзьце вобразы мора, створаныя мастаком Іванам Айвазоўскім. Як вы лічыце, чаму мастак выкарыстаў розныя фарбы?



Правообладатель Пачатковая школа

Уступ да оперы «Садко» — музычны малюнак мора. Стварыць яе М. Рымскаму-Корсакаву дапамог досвед уласных марскіх падарожжаў.

Вось што пісаў ён у сваіх лістах: «Чудные дни и чудные ночи! Дивный, тёмно-лазоревый днём свет океана сменялся фантастическим фосфорическим свечением ночью. С приближением к югу сумерки становились всё короче и короче, а южное небо с новыми созвездиями всё более и более открывалось. Вскоре все звёзды обоих полушарий стали видны. Свет ныряющего среди кучевых облаков месяца в полнолуние просто ослепителен. Чудесен тропический океан со своей лазурью и фосфорическим светом...»




## Акіян-мора сіняе

*(уступ да оперы «Садко»)*

Музыка М. Рымскага-Корсакава

1. Якім паўстае мора ў творы Мікалая Рымскага-Корсакава: спакойным ці бурлівым, грозным ці лагодным? Якія пачуцці ў вас выклікае музыка?
2. Якія рухі рук вам спатрэбяцца, каб перадаць невялікія хвалі? А грозныя, моцныя, высокія хвалі? Уявіце сябе дырыжорамі і свабодна дырыжыруйце творам.



Правообладатель Пачатковая школа

# БЛІЗКАСЦЬ МАЎЛЕНЧАЙ І МУЗЫЧНАЙ ІНТАНАЦЫІ

Музычная інтанацыя вельмі блізкая да інтанацыі маўленчай, аднак значна больш выразная.

Вам ужо знаёмы апавядальныя, пытальныя і клічныя маўленчыя інтанацыі. У музыцы таксама можна сустрэць інтанацыі апавядальнага, пытальнага альбо сцвярджальнага характару.

**Апавядальная інтанацыя** гучыць спакойна. Ёй уласцівы роўны рух, адсутнасць рэзкіх змен вышыні і працягласці гукаў.



**Пытальная інтанацыя** ў музычных творах звычайна гучыць няўстойліва. Калі перадаць яе пры дапамозе лініі, то можна заўважыць, што выява нагадвае пытальнік.



**Сцвярджальная інтанацыя** гучыць упэўнена. Яе лёгка пазнаць па актыўным руху ўверх альбо ўніз, спыненні на тоніцы — найбольш устойлівым гуку.





Правообладатель Пачатковая школа

# Як пагнала бабуленька куранятак пасці

Беларуская народная песня








Правообладатель Пачатковая школа






Правообладатель Пачатковая школа

2. Як пагнала бабуленька куранятак пасці,
сама села на пянёчку кудзелечку прасці.
Яшчэ нітак не ссучыла, а ўжо двух згубіла.
Сюды-туды павярнулась
ды на трэцяе спаткнулась.

4. Як прыехаў дзедка з лесу ды да сваёй хаты,
пытаецца у бабулькі: «А дзе ж кураняты?
Цып-цып-цып-цып-цып-цып-цып!
Пуль-пуль-пуль-пуль-пуль-пуль-пуль!
А дзе ж кураняты?»

5. «Як не ведаў, дзеду, так не будзеш ведаць!
Вось садзіся лепш за стол — дам табе абедаць.
Хадзі-хадзі, мой дзядок,
хадзі-хадзі, галубок, —
дам табе абедаць».

6. Разгневаўся дзедка, схапіў саламінку,
пабіў бабцы, пахвастаў галаву і спінку.
Ой-ёй-ёй-ёй-ёй-ёй-ёй!
Ой-ёй-ёй-ёй-ёй-ёй-ёй,
галаву і спінку!

**1.** Прачытайце тэкст песні. Знайдзіце ў ім апавядальныя і пытальныя інтанацыі. Прачытайце тэкст выразна, потым — праспявайце песню. Што агульнае, а што рознае ў маўленчай і музычнай інтанацыях?


Правообладатель Пачатковая школа

2. Пытальныя сказы «Ой, божа ж мой, божа, а што мне рабіці?» і «А дзе ж кураняты?» розныя па характары. Што перадае кожны з іх?

3. Адлюструйце пытальныя інтанацыі пры дапамозе ліній. Замалюйце іх у сшытку альбо на дошцы.

Уважліва прачытайце верш. Перадайце выразнасць апавядальнай інтанацыі.

На сыром на дубу
сидит ворон, чёрный ворон.
А под дубом сырым
волк гуляет в чистом поле...

## Няньчына казка

*(з «Дзіцячага альбома»)*

Музыка П. Чайкоўскага





Правообладатель Пачатковая школа

1. Якую карціну вы ўявілі пры праслухоўванні п’есы Пятра Чайкоўскага?
2. Якія сродкі музычнай выразнасці выкарыстаў кампазітар, каб перадаць апавядальны характар музыкі?
3. Параўнайце інтанацыю верша і музычнага твора. Што ў іх агульнае, што featureрознае?

## ЗЕРНЕ-ІНТАНАЦЫЯ

Музычную інтанацыю часта параўноўваюць з зернем, з якога «вырастае» музычны твор. Як сапраўднае зерне, музычная інтанацыя невялікая па памеры. Складаецца яна звычайна з некалькіх гукаў.

Зерне-інтанацыя ўтрымлівае ўсе рысы будучага твора. Гэта інтанацыя вельмі выразная, таму яе лёгка вылучыць у плыні гукаў.



Зерне-інтанацыя з «Паланэза» (музыка Ф. Шапэна)



Зерне-інтанацыя з песні «Дуб» (музыка А. Чыркуна)



Правообладатель Пачатковая школа

1. Праспявайце альбо праслухайце зерні-інтанацыі. Ці аднолькавыя яны па характары? Чаму вы так лічыце?
2. Вам ужо знаёмы творы, якія «выраслі» з гэтых зерняў-інтанацый. Паразважайце, як характар зерняў-інтанацый паўплываў на характар музычных твораў.
3. Па нотным запісе лёгка прасачыць, як з інтанацыі «вырастае» мелодыя. Прыгадайце знаёмую вам песню «Дуб» Алега Чыркуна на словы Янкі Купалы. Праспявайце зерне-інтанацыю. Прасачыце па нотным запісе, як з яе «вырастае» мелодыя.



## Сеў жучок на сучок

Беларуская народная песня






Правообладатель Пачатковая школа

1. Праспявайце беларускую народную песню. Вылучыце ў ёй зерне-інтанацыю.
2. Уявіце сябе кампазітарамі і паспрабуйце «вырасціць» мелодыю з гэтага «зерня». Запішыце яе ў сшытку альбо на дошцы.

## Восеньскі малюнак

Музыка Я. Паплаўскай



1. Праспявайце зерне-інтанацыю. Вызначце яе характар.
2. Уявіце сябе кампазітарамі. Якая мелодыя магла б «вырасці» з гэтай інтанацыі?
3. Уважліва паслухайце твор. Прасачыце, якія мелодыі «выраслі» з «зерня» ў першай, другой і трэцяй частках твора. Падбярыце словы, каб перадаць характар кожнай з мелодый.

## ВЫРАЗНАЯ ІНТАНАЦЫЯ

Музычныя інтанацыі вельмі разнастайныя. Тыя з іх, якія адлюстроўваюць унутраны свет чалавека, мы называем выразнымі. Пры дапамозе выразных



Правообладатель Пачатковая школа

інтанацый кампазітары перадаюць пачуцці чалавека, яго настрой.

## Радость

Радость пробежала по дорожке.
Радость распахнула все окошки.
Радуется клён, что он силён:
радугу на ветке держит он.
Рады зайцы, что спугнули волка.
Новым шишкам радуется ёлка.
Радость запрягает лошадей.
Разбудите, дети, всех людей!
Надевайте лучшие одёжки —
распахнула радость все окошки.

*М. Карэм (пераклад В. Берастава)*

1. Які настрой пануе ў вершы? Што выклікáе ў вас адчуванне радасці? Ці радуецеся вы новаму дню, хараству прыроды, добрым справам і ўчынкам?
2. Пры дапамозе алоўкаў стварыце ў сшытку колеравую выяву радаснага пачуцця. Якія колеры вам спатрэбяцца? Абгрунтуйце свой выбар.

Кампазітары ў сваіх творах часта перадаюць розныя адценні чалавечых пачуццяў.



Правообладатель Пачатковая школа

## Весёлая песенка

Словы В. Віктарава Музыка Г. Струвэ



Рухава, з запалам






Правообладатель Пачатковая школа




1. Уважліва паслухайце песню. Які настрой яна перадае? Як мелодыя песні, яе пульс і тэмп дапамагаюць стварыць настрой музыкі?

2. Параўнайце песню Георгія Струвэ і верш Марыса Карэма. Што ў іх агульнае, а што рознае?

3. Выканайце песню. Дадайце да выканання рытмічны акампанемент.






Правообладатель Пачатковая школа

## Грустная песенка

Словы В. Віктарава

Музыка Г. Струвэ








Правообладатель Пачатковая школа




2. Мама очень грустит —
потерялся сынок.
Он, наверно, устал,
он, наверно, продрог.
Бедный лисёнок,
бедная мама.

3. Мы не знаем, найдёт ли
лисёнка она.
И поэтому песня
наша очень грустна.
Бедный лисёнок,
бедная мама.

1. Якім настроем прасякнута песня? Падбярыце словы, якія адпавядаюць характару музыкі.

2. Параўнайце «Весёлую песенку» і «Грустную песенку». Пры дапамозе якіх сродкаў музычнай выразнасці кампазітар перадае розныя пачуцці чалавека?


Правообладатель Пачатковая школа



**Эдвард Грыг**
(1843–1907)

**Эдвард Грыг** — славуты нарвежскі кампазітар. Яго музыка перадае прыгажосць нарвежскай прыроды, таямнічы свет народных паданняў, своеасаблівасць інтанацый народнай музыкі.

Сусветна вядомыя творы Э. Грыга — канцэрт для фартэпіяна з аркестрам, музыка да драмы Генрыка Ібсэна «Пэр Гюнт».

Юнак Пэр Гюнт выпраўляецца вандраваць па свеце ў пошуках шчасця. Ён наведвае розныя краіны, сустракаецца з рознымі людзьмі.

А дома яго чакае нявеста Сольвейг. Яна вельмі сумуе з-за разлукі з каханым. У яе песні адчуваюцца сум, самота, надзея...


Правообладатель Пачатковая школа

 

# Песня Сольвейг

*(з музыкі да драмы Г. Ібсэна «Пэр Гюнт»)*

Пераклад М. Слонава — Музыка Э. Грыга






1. Услухайцеся ў гучанне музыкі, паспрабуйце адчуць яе настрой. Што спрыяе стварэнню настрою — мелодыя, тэмп, рытм?



Правообладатель Пачатковая школа

2. Характар музыкі змяняецца на працягу твора. Як вы лічыце чаму?

3. Пры дапамозе алоўкаў зрабіце ў сшытку колеравую выяву першай часткі твора. Якія колеры вам спатрэбяцца? Чаму?

## ВЫЯЎЛЕНЧАЯ ІНТАНАЦЫЯ

Выяўленчыя інтанацыі дапамагаюць кампазітару перадаць прыгажосць навакольнага свету. Яны дазваляюць кампазітару ўвасобіць у музыцы шум дажджу, грукат грому, шэпт лісця, булькатанне вады, спевы птушак...

### Зязюля

Швейцарская народная песня








Правообладатель Пачатковая школа






Правообладатель Пачатковая школа

2. Мне весела заўсёды.
Саджуся на суку,
адлічваю я годы:
«Ку-ку, ку-ку, ку-ку!»

3. Калі усюды звонка
разносіцца «Агу!»,
з галіны сваёй тонкай
адказваю: «Ку-ку!»

4. Гнязда не ўю крыкліва,
сяджу ў чужым кутку.
Ў птушыны хор сварлівы
крычу і я: «Ку-ку!»

*Пераклад І. Хвораста*

1. Вылучыце ў песні зерне-інтанацыю. Які характар мае гэта інтанацыя?
2. Знайдзіце ў нотным запісе выяўленчую інтанацыю. Праспявайце яе, потым запішыце ў сшытку альбо на дошцы.
3. Спявайце песню весела, актыўна. Упрыгожце яе выкананне рытмічным акампанементам.


Правообладатель Пачатковая школа



**Іозеф Гайдн**
(1732–1809)

**Іозеф Гайдн** — выдатны аўстрыйскі кампазітар. Яго музычная спадчына ўключае 24 оперы, 104 сімфоніі, шмат канцэртаў і інструментальных ансамбляў. Сімфоніі І. Гайдна называюцца «Паляванне», «Мядзведзь», «Курыца» і інш. Адна з сімфоній мае назву «Гадзіннік».

Здагадайцеся, чаму кампазітар даў ёй такую назву.



## Сімфонія № 101 «Гадзіннік»

*(урывак з 2-й часткі)*

Музыка І. Гайдна



М. Шагал. «Гадзіннік»

1. Як музыка перадае ход гадзінніка? Які гэта гадзіннік — вялікі ці малы?
2. Разгледзьце карціну Марка Шагала. Што аб'ядноўвае яе з творам Іозефа Гайдна?



Правообладатель Пачатковая школа

**3.** Прыдумайце невялікае апавяданне пра гадзіннік. Прасачыце, каб сюжэт адпавядаў развіццю музыкі.



**Уладзімір Мітрафанавіч Кур'ян**
(нарадзіўся ў 1954 г.)

**Уладзімір Кур'ян** — сучасны беларускі кампазітар. Ён плённа працуе ў розных музычных жанрах, аднак найбольш вядомы як тэатральны кампазітар. Сярод яго работ — музыка да спектакляў «Ідылія», «Тапалёвая завея», «Тутэйшыя».

Пазнаёмцеся з музычнай п'есай У. Кур'яна «Гадзіннік».



## Гадзіннік

Музыка У. Кур'яна

1. Пры дапамозе якіх інструментаў кампазітар перадае ход і бой гадзінніка?
2. Параўнайце п'есу Уладзіміра Кур'яна з сімфоніяй Іозефа Гайдна. Што ў іх агульнае, а што рознае?



Правообладатель Пачатковая школа

# ВЫРАЗНАЯ І ВЫЯЎЛЕНЧАЯ ІНТАНАЦЫІ СУСТРАКАЮЦЦА Ў АДНЫМ ТВОРЫ

У музыцы кампазітар можа адлюстроўваць карціны навакольнага свету і перадаваць уласныя пачуцці, настрой. Таму часта выразная і выяўленчая інтанацыі спалучаюцца ў адным творы.

## Зима

Словы Я. Баратынскага — Музыка Ц. Кюі




1. Як у музыцы Цэзара Кюі перадаюцца карціны зімы і ўражанні ад яе надыходу?
2. Вызначце характар музычнай інтанацыі. Перадайце яе пры дапамозе лініі. Замалюйце ў сшытку альбо на дошцы.


Правообладатель Пачатковая школа



**Ігар Міхайлавіч Лучанок**
(нарадзіўся ў 1938 г.)

**Ігар Лучанок** — вядомы беларускі кампазітар-песеннік. Яго песні «Мой родны кут», «Спадчына», «Алеся», «Жураўлі на Палессе ляцяць», «Майский вальс» шырока вядомы ў нашай краіне і за яе межамі.

## Зіма

Словы Я. Коласа — Музыка І. Лучанка






Правообладатель Пачатковая школа




1. Якую карціну вы ўявілі падчас гучання музыкі? Дзеля чаго кампазітар выкарыстаў павольны тэмп, буйныя працягласці?
2. Праспявайце песню. Перадайце яе настрой пры выкананні.
3. Творы Цэзара Кюі і Ігара Лучанка маюць аднолькавыя назвы. Што агульнае ў музыцы гэтых твораў? Што living рознае?
4. Угледзьцеся ў карціну Вітольда Бялыніцкага-Бірулі. Што аб'ядноўвае яе з творам Ігара Лучанка?


Правообладатель Пачатковая школа



В. Бялыніцкі-Біруля. «Зімовы сон»

## Мароз

Іду я, сняжысты, ўсясільны,
па сцежках-пуцінах пустых,
і ночкай, і днём безупынна
пільную абшараў сваіх.

Палац мой — лес буйны, вяцвісты —
ірдзіцца брыльянтамі скрозь,
мне воўк і мядзведзь у паслугах,
мне служаць вавёрка і лось.

Як пухам, сняжком пасыпаю
і хвою, і елку, і клён;
хто ў госці ка мне забярэцца,
тулю тых, галублю іх сон.



Правообладатель Пачатковая школа

Іду я, сняжысты, ўсясільны,
па сцежках-пуцінах пустых,
і ночкай, і днём безупынна
пільную абшараў сваіх.

*Я. Купала*

1. Якім паўстае зімовы лес у вершы Янкі Купалы?
2. Знайдзіце словы, якія дапамагаюць уявіць зімовы лес.



**Валерый Іванавіч Карэтнікаў**
(нарадзіўся ў 1941 г.)

**Валерый Карэтнікаў** — беларускі кампазітар, які напісаў шмат твораў для дзяцей, у тым ліку сюіту для сімфанічнага аркестра «Поры года». У ёй кампазітар перадаў прыгажосць кожнага з дванаццаці месяцаў. Адна з частак сюіты называецца «У зімовым лесе».

**Сюіта** — музычны твор, які складаецца з некалькіх розных па характары п'ес, аб'яднаных агульнай задумай.



Правообладатель Пачатковая школа

## У зімовым лесе

*(з сюіты «Поры года»)*

Музыка В. Карэтнікава



1. Як кампазітар пры дапамозе музыкі перадаў карціну зімовага лесу?
2. Ці змяняецца стан зімовай прыроды ў творы Валерыя Карэтнікава?
3. Параўнайце будову музычнага твора з будовай верша Янкі Купалы. Што іх аб'ядноўвае?

## Новы год

Пасінеў на рэках лёд,
неба ў ясных зорках.
Зноў прыйшоў к нам
Новы год
з песнямі і ёлкай.

Водзіць з намі карагод
сам Мароз-дзядуля.
Многа казак у яго
і вясёлых гульняў.

*М. Чарняўскі*



Правообладатель Пачатковая школа

1. Як у вершы Міколы Чарняўскага перадаецца набліжэнне навагодняга свята?
2. Уявіце, якой магла б быць музыка, напісаная на гэты верш. Вызначце яе характар, лад, тэмп.

## Навагодні карагод

Словы В. Лучанок Музыка І. Лучанка








Правообладатель Пачатковая школа




2. Скора, скора завітае Дзед Мароз.
Падарункаў прынясе ён цэлы воз.
Мы дзядулю сустракаем,
звонка, весела спяваем.
Слухай, калі ласка, Дзед Мароз! *(2 разы)*

3. Надыходзіць, надыходзіць Новы год.
Мы вавёрачку пазвалі ў карагод,
зайку, вожыка, лісіцу —
будзем разам весяліцца.
Кружыцца святочны карагод! *(2 разы)*

4. Дзед Мароз прыйшоў з гасцінцамі, ура!
І агеньчыкі запальваць нам пара.
Дружна скажам: «Раз, два, тры,
ярка, ёлачка, гары!»
Радуецца святу дзетвара! *(2 разы)*


Правообладатель Пачатковая школа



1. Якім настроем прасякнута музыка? Якія сродкі музычнай выразнасці спатрэбіліся кампазітару, каб перадаць яго?
2. Выканайце песню. Прыдумайце да яе выразныя танцавальныя рухі. На які танец яны падобныя?

## Вальс каля навагодняй ёлкі

*(з сюіты «Поры года»)*

Музыка В. Карэтнікава

1. Уважліва паслухайце музыку. Якія прыкметы навагодняга свята ў ёй чутны?
2. Які характар музычнай мовы абраў кампазітар для свайго твора? Чаму?



Правообладатель Пачатковая школа

# АБАГУЛЬНЕННЕ ТЭМЫ ДРУГОЙ ЧВЭРЦІ

1. Вы ведаеце, што маўленчая і музычная інтанацыі роднасныя адна адной. Што ў іх агульнае, а што рознае?

2. Чаму інтанацыю часта параўноўваюць з зернем? Якія асаблівасці ёй уласцівы?

3. Інтанацыі могуць перадаваць тонкія адценні чалавечых пачуццяў. Як называюцца такія інтанацыі? У якіх музычных творах вы з імі сустракаліся? Якія пачуцці былі перададзены ў іх? Згадайце творы, якія вам найбольш спадабаліся.

4. Інтанацыі таксама могуць адлюстроўваць прыгажосць навакольнага свету. У якіх музычных творах вам сустрэліся выяўленчыя інтанацыі? Падбярыце з музыкі, якая гучала на ўроках, творы для сваёй музычнай калекцыі.

5. Разнастайнасць інтанацый у адным творы дазваляе адначасова ўвасобіць карціны прыроды і жыцця і перадаць пачуцці, выкліканыя імі. Прывядзіце прыклады такіх твораў.

6. Якімі інтанацыямі — маўленчымі, музычнымі, пластычнымі — вы карыстаецеся ў паўсядзённым жыцці?



Правообладатель Пачатковая школа

# РАЗВІЦЦЁ МУЗЫКІ

## ЯК РАСКАЗВАЮЦЬ І СЛУХАЮЦЬ МУЗЫЧНЫЯ ГІСТОРЫІ

Звычайна, слухаючы музычны твор, мы лёгка заўважаем змяненні тэмпу, рытму, сілы гуку, ладавай афарбоўкі. Ужыванне тых ці іншых сродкаў музычнай выразнасці заўсёды звязана са зместам музыкі. Змяненне музыкі азначае яе развіццё.

Каб расказаць музычную гісторыю, кампазітар адбірае неабходныя сродкі музычнай выразнасці. Таксама кампазітар вырашае, у выкананні якога саставу музыкантаў твор будзе гучаць найбольш выразна.

Выканаўца дапамагае аўтару распавесці музычную гісторыю. Ён надае твору непаўторныя, своеасаблівыя рысы. Менавіта таму адзін і той жа твор у розным выкананні гучыць па-свойму.

Слухачы музыку, мы, у сваю чаргу, разгадваем задуму кампазітара.



Правообладатель Пачатковая школа



**Антоніа Вівальдзі**
(1678–1741)

**Антоніа Вівальдзі** — славуты італьянскі кампазітар і скрыпач-віртуоз. Ім створана 465 інструментальных канцэртаў. Больш за палову з іх кампазітар напісаў для свайго любімага інструмента — скрыпкі.

## Канцэрт для скрыпкі з аркестрам «Зіма» *(частка 1)*

*(з цыкла «Поры года»)*

Музыка А. Вівальдзі

1. Якую карціну малюе музыка?
2. Якія сродкі музычнай выразнасці выкарыстаны ў творы?
3. Параўнайце музычную мову партый саліста і аркестра. Што ў іх агульнае, а што рознае?



Правообладатель Пачатковая школа

## Почему медведь зимой спит

Словы А. Каваленкава | Музыка Л. Кніпера



1. Раз морозною зимой
вдоль опушки лесной
шёл медведь к себе домой
в тёплой шубе меховой.
Шёл он, шёл к своей берлоге
по просёлочной дороге
и, шагая через мост,
наступил лисе на хвост.

2. Подняла́ лисица крик,
зашумел тёмный лес,
и медведь с испугу вмиг
на сосну большую влез.
На сосне весёлый дятел
белке домик конопатил
и промолвил: «Ты, медведь,
должен по́д ноги смотреть».



3. С той поры медведь решил,
что зимой нужно спать,
по тропинкам не гулять,
на хвосты не наступать.
Он в берлоге безмятежно
спит зимой под крышей снежной
и доволен неспроста,
что родился без хвоста.





Правообладатель Пачатковая школа

1. Якія сродкі музычнай выразнасці дапамагаюць кампазітару распавесці аб прыгодах мядзведзя?
2. Падбярыце адпаведныя сродкі музычнай выразнасці для выканання. Прадугледзьце ўдзел саліста.
3. Выканайце песню з элементамі тэатралізацыі.

## ЯК РАЗВІВАЕ МУЗЫКУ КАМПАЗІТАР

Каб стварыць музычную карціну, кампазітар карыстаецца рознымі спосабамі музычнага разіцця. Ён можа развіваць мелодыю, змяняць тэмп, дынаміку, лад, тэмбр і рэгістр гучання. Таксама аўтар можа ўжываць кантраснае супастаўленне частак твора.

### Снежны гарадок

*(з сюіты «Поры года»)*

Музыка В. Карэтнікава




Правообладатель Пачатковая школа

1. Уважліва паслухайце твор. Як вы лічыце, што імкнуўся адлюстраваць кампазітар? Якія сродкі музычнай выразнасці для гэтага спатрэбіліся?
2. Якую ролю ў стварэнні зімовай карціны адыгрывае сімфанічны аркестр? Тэмбры якіх інструментаў вы пазналі?
3. Узгадайце ўжо знаёмыя вам часткі сюіты Валерыя Карэтнікава «Поры года»: «У зімовым лесе» і «Вальс каля навагодняй ёлкі». Параўнайце музычную мову ўсіх трох частак, прысвечаных зіме.

## Снегопад

Словы Э. Фарджан (пераклад М. Барадзіцкай)

Музыка Ж. Металідзі






Правообладатель Пачатковая школа




1. Праспявайце песню. Вылучыце зерне-інтанацыю. Выразная ці выяўленчая гэта інтанацыя?
2. Паназірайце за развіццём інтанацыі. Замалюйце рух мелодыі ў сшытку альбо на дошцы.
3. Звярніце ўвагу на акампанемент. Як ён змяняецца на працягу твора?
4. Якую карціну «намаляваў» кампазітар з дапамогай музыкі?


Правообладатель Пачатковая школа

# РАЗВІЦЦЁ МЕЛОДЫІ

Ці знаёмы вам выраз «Мелодыя — гэта душа музыкі»? Мелодыя — гэта музычная думка. Яна выконваецца голасам альбо на музычным інструменце. Само слова «мелодыя» ў перакладзе з грэчаскай мовы значыць «напеў», «песня».

Паходжанне мелодыі цесна звязана з маўленнем чалавека, маўленчымі інтанацыямі. Аднак мелодыя значна больш выразная за маўленне.

Калі ўгледзецца ў нотны запіс, можна заўважыць асаблівасці будовы мелодыі. У ёй вылучаюцца працягласць і вышыня гукаў.

## Песенка солнечных зайчиков

Словы Ф. Лаўбэ — Музыка В. Казеніна






Правообладатель Пачатковая школа




2. А один был зайчик ярче всех,
вызывал улыбки он и смех.
Был тот зайчик солнышком рождён,
находил друзей повсюду он. *(2 разы)*

3. Прыгал зайчик не жалея сил,
и тепло и свет он всем дарил.
И кричали вслед ему друзья:
«Жить без дружбы на земле нельзя!» *(2 разы)*

1. Які настрой выклікае ў вас песня? Праспявайце яе.
2. Уявіце, што людзі раптам перасталі ўсміхацца. Ці змянілася б наша жыццё? Абгрунтуйце свой адказ.
3. Выканайце рытм першых двух тактаў песні. Запішыце рытмічны малюнак на дошцы, а потым у сшытку.


Правообладатель Пачатковая школа

**4.** Суправаджайце спевы выкананнем рытмічнага малюнка. Ці змяняецца ён на працягу твора?

**5.** Прасачыце за рухам мелодыі і замалюйце яго ў сшытку. Што ў вас атрымалася? Падумайце, за кошт чаго кампазітар развівае мелодыю.

## Варона на слізкім даху

Музыка Г. Гарэлавай



**1.** Якую карціну малюе музыка?

**2.** Якія сродкі музычнай выразнасці спатрэбіліся кампазітару, каб стварыць музычную замалёўку?

**3.** Як развіццё мелодыі дапамагае адлюстраваць тупаценне і коўзанне вароны?



Правообладатель Пачатковая школа

# ДЫНАМІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ МУЗЫКІ

Кампазітары часта выкарыстоўваюць змяненне сілы гуку для развіцця музыкі. Гэта дазваляе адлюстроўваць найбольш тонкія адценні ў стане прыроды і пачуццях чалавека.

Змяненне сілы гуку можа быць раптоўным альбо паступовым. Паступовае нарастанне гучнасці ў музыцы называецца **крэшчэнда.** Паступовае змяншэнне гучання называецца **дымінуэнда.**



Крэшчэнда



Дымінуэнда



## Была тишина

Была
тишина,
тишина,
тишина...
Вдруг
грохотом
грома
сменилась
она!
И вот уже дождик
тихонько —





Правообладатель Пачатковая школа

ты слышишь? —
закрапал,
закрапал,
закрапал
по крыше...
Наверно,
сейчас
барабанить
он станет...
Уже
барабанит!
Уже
барабанит!

*А. Шыбаеў*



1. Пры дапамозе якіх сродкаў аўтар адлюстроўвае цішыню, грукатанне грому, пачатак і нарастанне дажджу?
2. Зрабіце колеравую выяву верша. Якія фарбы і адценні вам спатрэбяцца?
3. Выразна прачытайце верш. Выкарыстайце разнастайныя дынамічныя адценні, крэшчэнда і дымінуэнда.

У музыцы кампазітары часта карыстаюцца прыёмам узмацнення альбо змяншэння сілы гуку.



Правообладатель Пачатковая школа



## Раніца

*(з музыкі да драмы Г. Ібсэна «Пэр Гюнт»)*

Музыка Э. Грыга



1. Якую карціну малюе музыка?
2. Якія сродкі музычнай выразнасці выкарыстаў кампазітар, каб перадаць прыгажосць узыходу сонца? Прасачыце, як змяняецца музыка на працягу твора.
3. Адлюструйце змяненні сілы гуку пры дапамозе каляровых алоўкаў. Так у вас атрымаецца своеасаблівая «стужка адценняў».
4. Прадырыжыруйце творам. Сачыце, каб рухі рук суадносіліся з сілай гуку. Ці аднолькавыя яны ў пачатку і ў канцы твора?



Правообладатель Пачатковая школа

## ТЭМПАВАЕ РАЗВІЦЦЁ МУЗЫКІ

Тэмп у музыцы вызначае хуткасць руху. У сваіх творах кампазітары часта развіваюць музычную думку з дапамогай змянення тэмпу.

### Как под мельницей

Словы народныя

Музыка М. Андрэевай








Правообладатель Пачатковая школа

1. Што дапамагае адлюстраваць змяненне тэмпу ў сярэдзіне твора?
2. Паспрабуйце выканаць папеўку не змяняючы тэмпу. Ці змяніўся характар музыкі?
3. Звярніце ўвагу на тое, што словы папеўкі — народныя. З дапамогай якіх сродкаў кампазітар надаў музыцы народны характар?

## Поезд

Словы Т. Сікорскай

Музыка М. Мятлова



1. Вот поезд наш длинный
несётся, летит,
вагон за вагоном
по рельсам скользит.
2. Леса и поляны
мелькают кругом,
а поезд наш мчится
и ночью и днём.
3. Но вот остановка,
раздался звонок,
в путь тронулся поезд,
уж слышен свисток.
4. И снова наш поезд
несётся, летит.
Змеёй извиваясь,
по рельсам скользит...



Правообладатель Пачатковая школа

1. Якія змяненні тэмпу вы заўважылі? Як вы лічыце, чым выкліканы гэтыя змяненні?
2. Звярніце ўвагу на акампанемент. Што ён нагадвае?
3. Вызначце, у якіх месцах вы будзеце паскараць альбо запавольваць тэмп. Праспявайце песню.

## У пячоры горнага караля

*(з музыкі да драмы Г. Ібсэна «Пэр Гюнт»)*

Музыка Э. Грыга



Вандруючы ў пошуках шчасця, Пэр Гюнт трапляе ў падземнае царства, дзе ўладарыць горны кароль. Паступова пячора напаўняецца казачнымі істотамі...

1. Якія сродкі выразнасці дапамаглі кампазітару стварыць карціну падземнага царства, населенага казачнымі істотамі?



Правообладатель Пачатковая школа

2. Якую ролю ў развіцці музыкі адыгрывае тэмп? Ці захаваўся б настрой твора, калі б тэмп быў нязменны?

## ТЭМБРАВАЕ І РЭГІСТРАВАЕ РАЗВІЦЦЁ МУЗЫКІ

На працягу гучання твора мелодыя можа захоўваць нязменную афарбоўку. Аднак значна часцей кампазітары «даручаюць» выкананне розным галасам альбо інструментам. У выніку афарбоўка мелодыі змяняецца. У гэтым выпадку мы гаворым аб тэмбравым развіцці музыкі.

Вы ўжо ведаеце, што ў інструмента і голасу ёсць нізкі, сярэдні ці высокі рэгістр гучання. Змяняючы рэгістры, кампазітары па-новаму афарбоўваюць музычныя інтанацыі.

### Вясельны дзень у Трольхаўгене

Музыка Э. Грыга

1. З якой інтанацыі — выразнай ці выяўленчай — пачынаецца твор? Дзе яна гучыць — у мелодыі ці ў акампанеменце?
2. Вызначце характар музычнай мовы твора.



Правообладатель Пачатковая школа

**3.** Якія сродкі музычнай выразнасці спатрэбіліся кампазітару, каб адлюстраваць набліжэнне і аддаленне святочнага шэсця?

## Медведь и комар

Словы В. Шуміліна

Музыка А. Праслянёва








Правообладатель Пачатковая школа




1. Якую карціну малюе музыка?
2. Колькі выяўленчых інтанацый вы пачулі? Дзе яны гучаць — у мелодыі ці ў акампанеменце?
3. Якія сродкі музычнай выразнасці спатрэбіліся кампазітару, каб увасобіць камара і мядзведзя?
4. Праспявайце песню.


Правообладатель Пачатковая школа

**Фантазія** — буйны музычны твор. У перакладзе з грэчаскай мовы «фантазія» значыць «уяўленне». Фантазія вылучаецца свабоднай будовай і разнастайнасцю музычнага развіцця.



## Фантазія на тэму беларускай народнай песні «Перапёлачка»

Музыка Я. Глебава



1. Прыгадайце знаёмую вам песню «Перапёлачка». Якім пачуццём яна прасякнута? Як інтанацыя прыпеву дазваляе найбольш выразна перадаць пачуццё жалю да птушкі?
2. Мелодыя ў фантазіі ўвесь час змяняе сваю афарбоўку. Тэмбры якіх інструментаў вы пазналі?
3. Як тэмбравае развіццё ўплывае на характар музыкі?



Правообладатель Пачатковая школа

# ЛАДАВАЕ РАЗВІЦЦЁ МУЗЫКІ

Гукі ў музычным творы заўсёды звязаны паміж сабой. Яны ўтвараюць пэўны парадак, зладжанасць. Такі парадак у музыцы мае сваю назву — **лад**.

На працягу стагоддзяў людзі стварылі розныя музычныя лады. Аднак шырокае ўжыванне атрымалі толькі два з іх — ***мажор*** і ***мінор***. Мажорнаму ладу ўласцівы больш светлыя, яркія фарбы. Мінорнаму — мяккія, прыглушаныя.



**Франц Шуберт**
(1797–1828)

**Франц Шуберт** — вядомы аўстрыйскі кампазітар. За сваё кароткае жыццё ён напісаў вялікую колькасць твораў. Каб прайграць іх адзін за адным, спатрэбіцца больш за месяц! Асабліва многа Ф. Шуберт напісаў песень, вальсаў і маршаў.

Музыку Ф. Шуберта ведаюць і любяць ва ўсім свеце. Яна надзвычай напеўная і меладычная.



Правообладатель Пачатковая школа

## Вальс

Музыка Ф. Шуберта

1. Ці аднолькавы настрой вы адчуваеце на працягу гучання твора?
2. Якія сродкі музычнай выразнасці дапамагаюць кампазітару адлюстраваць адценні настрою?
3. Вызначце, у якой частцы твора пануе мажор, а ў якой — мінор. У час паўторнага слухання адлюструйце ладавае развіццё музыкі пры дапамозе картак з каляровай паперы.

У нотных запісах вам могуць сустрэцца адмысловыя знакі — дыез (♯) і бемоль (♭). Гэта знакі павышэння і паніжэння гуку.

**Дыез** — знак, які павышае гук.
**Бемоль** — знак, які паніжае гук.

## Смоўж

Раіць пчолка смаўжу:
«Уцякай ад дажджу,
ад дажджу і грому
уцякай дадому!»
Смоўж смяецца:
«Дом жа свой
я заўжды нашу з сабой».

*Х. Жычка*





Правообладатель Пачатковая школа

1. Паміж кім ідзе размова ў вершы?
2. З якім пачуццём ставяцца героі адно да аднаго? Перадайце гэта пачуццё падчас чытання.

## Улитка

Словы С. Сяровай — Музыка В. Кікты






Правообладатель Пачатковая школа






Правообладатель Пачатковая школа

1. Ці захоўваецца аднолькавы настрой на працягу твора?
2. Вылучыце зерне-інтанацыю. Які спосаб развіцця мелодыі выкарыстаў кампазітар? Абгрунтуйце свой адказ.
3. Знайдзіце ў нотным запісе часткі, напісаныя ў міноры; у мажоры.
4. Які знак вы заўважылі ў нотным запісе?

У мажорным альбо мінорным ладзе кожны з гукаў суадносіцца з пэўнай ступенню. Пры змяненні ладу змяняецца вышыня трэцяй ступені. Пры пераходзе з мажору ў мінор гэта ступень паніжаецца, з мінору ў мажор — павышаецца.

Паспрабуйце самастойна стварыць папеўку і ўжыць у ёй ладавае развіццё музыкі. Выкарыстайце для гэтага прапанаваны верш.

## Тучка

Тучка с солнышком опять
в прятки начали играть.
Только солнце спрячется —
тучка вся расплачется.
Только солнышко найдётся —
сразу радуга смеётся.

*В. Берастаў*



Правообладатель Пачатковая школа

1. Знайдзіце ў вершы месцы, дзе адчуваецца мажорны настрой; мінорны настрой.
2. Стварыце мелодыю для трэцяга і чацвёртага радкоў верша. У які «ладавы колер» (мажор ці мінор) вы яе афарбуеце?
3. Для пятага і шостага радкоў змяніце афарбоўку інтанацыі ў адпаведнасці са зместам твора. Які лад вам спатрэбіцца?

## МАЙСТЭРСТВА ВЫКАНАЎЦЫ

Звычайна рознымі спосабамі развіцця музыкі карыстаецца кампазітар. Аднак не толькі ён развівае музыку. Выканаўца таксама ўжывае сродкі музычнай выразнасці. Для кожнага твора ён складае выканальніцкі план.

Для гэтага выканаўца:

1) глыбока вывучае музычны твор;

2) аналізуе сродкі музычнай выразнасці, выкарыстаныя кампазітарам (сіла гуку, тэмп і інш.);

3) прадугледжвае змяненні сілы гуку і тэмпу адпаведна ўласнаму адчуванню музыкі;

4) дапаўняе гэтымі змяненнямі сродкі музычнай выразнасці, выкарыстаныя кампазітарам.



Правообладатель Пачатковая школа

## Как сделать утро волшебным

Чтобы сделать волшебным
весенний рассвет,
надо долго-долго идти
и охапку сияющих
жёлтых лучей
самому на дороге найти.

И добавить к сияющим
жёлтым лучам
охапку зелёных веток,
краешек неба,
пенье ручья
и маленьких птиц
всевозможных расцветок.

И добавить немного
тёплого ветра,
запах ландыша,
звон травы.
И потом ладошкой
плеснуть на это
совсем немного
речной синевы.

И всё это вместе перемешать,
закрыть глаза
и почти
не дышать!


Правообладатель Пачатковая школа

Клянусь, это будет
волшебным рассветом,
если никто не забудет
при этом
крикнуть маме:
«Доброе утро!»

*А. Дрыз (пераклад Р. Сефа)*

1. Самастойна падбярыце словы, якія адпавядаюць настрою верша.
2. Падбярыце сродкі музычнай выразнасці для стварэння выканальніцкага плана твора. Якім тэмпам і сілай гуку вы будзеце карыстацца?
3. Запішыце выканальніцкі план на дошцы. Выразна выканайце верш.

## Самая лепшая

Словы У. Карызны — Музыка С. Хвашчынскага






Правообладатель Пачатковая школа




2. Сонца парой залатою
   будзіць у росных гаях.
   Жаўранкаў просіць спяваць над зямлёю *(2 разы)*
   мама мая. *(3 разы)*

3. З ёй весялейшыя песні,
   радасць мілей удвая.
   Самая, самая лепшая ў свеце *(2 разы)*
   мама мая. *(3 разы)*

**1.** Пра што распавядае песня? Якія інтанацыі ляжаць у аснове песні?



Правообладатель Пачатковая школа

2. Прасачыце за развіццём музыкі. Якія спосабы музычнага развіцця выкарыстаў кампазітар?

3. Выберыце сродкі музычнай выразнасці для выканання песні. Стварыце выканальніцкі план.

У выканальніцкі план можна таксама ўключаць элементы тэатралізацыі, спевы саліста альбо групы, танцавальныя рухі. Гэта значна ўзбагачае выкананне, дазваляе зрабіць яго больш выразным.

## Тень-тень, потетень

Словы народныя — Музыка В. Каліннікава



**Не вельмі хутка**




1. Тень - тень, по - те - тень,



Правообладатель Пачатковая школа






Правообладатель Пачатковая школа

3. Похвалялися ежи:
«У нас шубы хороши!»
Похвалялись блохи:
«И у нас не плохи!»

4. Похвалялся медведь:
«Могу песни я петь!»
Похвалялася коза:
«Всем вам выколю глаза!»

1. Вызначце настрой песні.
2. Вылучыце салістаў. Размяркуйце тэкст песні паміж салістамі і хорам.
3. Падбярыце для свайго выканання сродкі музычнай выразнасці. Якім тэмпам і сілай гуку вы будзеце карыстацца? Чаму? Падбярыце тэмбравую афарбоўку для кожнага персанажа песні.

## МУЗЫЧНЫЯ ДЫЯЛОГІ

Як вы ведаеце, музычная інтанацыя вельмі падобная да маўленчай. А ці магчыма весці размову, разумець адзін аднаго з дапамогай музыкі? Для гэтага неабходна навучыцца такім чынам перадаваць у спевах і ігры ўласныя пачуцці, каб яны былі зразумелыя


Правообладатель Пачатковая школа

для суразмоўцы. Таксама трэба ўмець слухаць тых, хто размаўляе з вамі на мове музыкі.

## Вясна-красна

Беларуская народная песня



1. Паслухайце песню. Чаму яна прысвечана?
2. Якія інтанацыі вы адчулі ў песні?
3. З якім настроем трэба выконваць гэту песню?
4. Як сродкі музычнай выразнасці дапамагаюць ствараць музычны дыялог?



Правообладатель Пачатковая школа

# Сороконожки

Словы У. Арлова　　　　Музыка А. Даньшовай








Правообладатель Пачатковая школа






Правообладатель Пачатковая школа




1. У якой з частак песні вы адчулі музычны дыялог?
2. Вылучыце ў нотным тэксце пытальныя і сцвярджальныя інтанацыі. Адлюструйце іх у сшытку пры дапамозе ліній. Што ў вас атрымалася?
3. Чым адрозніваюцца выявы пытальнай і сцвярджальнай інтанацый?
4. Падзяліцеся на групы і выразна выканайце музычны дыялог.


Правообладатель Пачатковая школа

## АБАГУЛЬНЕННЕ ТЭМЫ ТРЭЦЯЙ ЧВЭРЦІ

1. Музыцы ўласціва развіццё, яна пастаянна змяняецца. Ад чаго залежыць змяненне сродкаў музычнай выразнасці? Абгрунтуйце свой адказ. Прывядзіце адпаведныя прыклады.
2. Галоўную ролю ў музыцы адыгрывае мелодыя. Якія змяненні адбываюцца ў мелодыі падчас яе развіцця?
3. На ўроках гучалі музычныя творы, якім уласціва тэмпавае, дынамічнае, рэгістравае і тэмбравае развіццё. Прыгадайце іх. На што ўплывае змяненне тэмпу, сілы гуку, рэгістру, тэмбру? Што дазваляюць адлюстраваць такія змяненні?
4. Вы пазнаёміліся з мажорным і мінорным ладам. Як у музыцы можна адлюстраваць святлацень? Што для гэтага патрэбна?
5. Ці толькі кампазітар карыстаецца сродкамі музычнага развіцця? Якія з іх ужывае выканаўца?
6. Музычная інтанацыя вельмі выразная, яна дазваляе весці дыялог на мове музыкі. Якія ўменні трэба набыць для вядзення музычнага дыялогу?
7. Згадайце музычныя творы, якія вам найбольш спадабаліся. Адбярыце іх для сваёй музычнай калекцыі.



Правообладатель Пачатковая школа

# БУДОВА (ФОРМЫ) МУЗЫКІ

## РАЗНАСТАЙНАСЦЬ БУДОВЫ МУЗЫЧНЫХ ТВОРАЎ

Кожны музычны твор вызначаецца ўласнай будовай, гэта значыць мае індывідуальную форму. Музычныя творы могуць складацца з адной, дзвюх, трох альбо большай колькасці частак.

### Прекрасен мир поющий

Словы В. Сцяпанава — Музыка Л. Абелян






Правообладатель Пачатковая школа




2. То радостно, то грустно,
то громче, то нежней
поёт скворец искусный
и маленький ручей.

3. Шумит ли сад цветущий,
идёт ли снег зимой —
прекрасен мир поющий,
и ты с ним вместе пой!

1. Якім настроем прасякнута песня? Падбярыце словы, якія яму адпавядаюць.
2. Праспявайце песню. Пры дапамозе сродкаў музычнай выразнасці «расфарбуйце» словы «то радостно, то грустно, то громче, то нежней».
3. Вызначце галоўную думку песні. Чаму яна нас вучыць?


Правообладатель Пачатковая школа

Для напісання твораў, музыка якіх прасякнута адным настроем, кампазітары выкарыстоўваюць адначасткавую форму. Калі ж для перадачы аўтарскай задумы неабходна выкарыстаць паўторы альбо кантрасты, кампазітары звяртаюцца да двухчасткавай, трохчасткавай будовы ці да формы ронда. Форма музычнага твора адлюстроўвае суадносіны кантрастаў і паўтораў у ім.

Прыгадайце знаёмыя вам творы і параўнайце іх будову са схемамі музычных форм.



## Жывіца

Словы Т. Мушынскай
Музыка А. Безенсон





## Песенка слонёнка о самом себе

Словы А. Зарубіна
Музыка А. Даньшовай





Правообладатель Пачатковая школа

## Хор «Целый день поём, играем»

*(з оперы «Воўк і сямёра казлянят»)*

Словы Я. Манучаравай — Музыка М. Каваля





1. Прыгадайце песню «Жывіца». Як вы лічыце, чаму ў ёй выкарыстаны дзве рознахарактарныя часткі?
2. Праспявайце «Песенку слонёнка о самом себе». Колькі частак вы заўважылі ў музыцы?
3. Прыгадайце хор «Целый день поём, играем» з оперы «Воўк і сямёра казлянят» Марыяна Каваля. Чаму кампазітар выкарыстаў форму, якая складаецца з некалькіх частак?
4. Ці змяніўся б змест твораў, калі б кампазітары выкарысталі іншыя музычныя формы?



Правообладатель Пачатковая школа

# КАНТРАСТЫ І ПАЎТОРЫ Ў ЖЫЦЦІ І Ў МУЗЫЦЫ

У жыцці мы часта сустракаемся з кантрастамі: дзень і ноч, зіма і лета, чорны і белы колеры. Кантрасты можна знайсці і ў вершах.

## У Белого моря

У Белого моря — белые волны,
у Белого моря — синие волны,
у Белого моря — зелёные волны,
у Белого моря — холодные волны,
у Белого моря — тёплые волны.
Тихие волны,
шумные волны,
высокие волны
и низкие волны
у Белого моря...

*Р. Заслаўскі*

1. Ці адчуваюцца ў вершы гукапераймальныя інтанацыі?
2. Знайдзіце ў вершы кантрасныя супастаўленні. Падбярыце выразныя выканальніцкія сродкі для іх адлюстравання.



Правообладатель Пачатковая школа

3. Прачытайце верш выразна, выкарыстоўваючы абраныя выканальніцкія сродкі.

У музычных творах мы таксама сустракаемся з кантрастамі. Для іх адлюстравання кампазітары выкарыстоўваюць розныя сродкі: ціхую і гучную дынаміку, хуткі і павольны тэмп, высокі і нізкі рэгістр, мажорны і мінорны лад.

Пры выкананні музычнага твора мы падкрэсліваем кантрасты, ужываючы розныя дынамічныя адценні і тэмпы.



**Мікалай Канстанцінавіч Літвін**
(нарадзіўся ў 1951 г.)

**Мікалай Літвін** — сучасны беларускі кампазітар, аўтар шматлікіх твораў аркестравай і вакальнай музыкі. Галоўнае месца ў творчасці М. Літвіна займае ўвасабленне вобразаў роднай Беларусі, адлюстраванне духоўнай прыгажосці беларускага народа.


Правообладатель Пачатковая школа

## Цёплыя дзянёчкі

Словы Л. Пранчака Музыка М. Літвіна






Правообладатель Пачатковая школа




1. Якія кантрасты вы заўважылі ў музыцы? Як яны суадносяцца са зместам твора?
2. Праспявайце песню. Звярніце ўвагу на дакладнае выкананне мажору і мінору.
3. Складзіце выканальніцкі план песні. Падкрэсліце кантрасты выкарыстаннем рознай сілы гуку.

У нотным запісе вам сустрэўся адмысловы знак — **бекар (♮)**. Ён скасоўвае дзеянне бемоля ці дыеза.



## Карагодны

Беларускі народны танец

Апрацоўка М. Чуркіна



Правообладатель Пачатковая школа

1. Які настрой пануе ў творы? Ці змяняецца ён на працягу гучання?
2. Якія кантрасты вы заўважылі? Якая іх роля ў музыцы?
3. Якія сродкі музычнай выразнасці выкарыстаў кампазітар, каб падкрэсліць кантрасты?

У жыцці часта сустракаюцца і паўторы: за зімой заўсёды прыходзіць вясна, ноч змяняе дзень, а пасля кожнага ўрока мы чуем званок на перапынак.

У музыцы таксама сустракаюцца паўторы. Для іх абазначэння існуе спецыяльны музычны знак — **рэпрыза**.



У перакладзе з французскай мовы слова «рэпрыза» значыць «паўтарэнне». Знак рэпрызы ў нотах сведчыць пра тое, што музыку неабходна паўтарыць.




## А мы грушу пасадзілі

Беларуская народная песня

Апрацоўка А. Рашчынскага






Правообладатель Пачатковая школа




1. Праспявайце песню па нотах. Знайдзіце ў нотным запісе рэпрызу.
2. Дакладна паўтарыце музыку ў адпаведнасці з нотным запісам.
3. Прыдумайце да песні выразныя танцавальныя рухі. На які танец яны падобныя?

## З ЧАГО СКЛАДАЕЦЦА МУЗЫЧНАЯ МОВА

Музычная мова вельмі падобная на гутарковую. У ёй таксама існуюць фразы і сказы.

Найменшая частка музычнай мовы называецца **матывам.** Часам матыў вельмі падобны да ўжо знаёмай


Правообладатель Пачатковая школа

вам музычнай інтанацыі. Калі аб'яднаць некалькі матываў у адно цэлае, атрымаецца музычная **фраза**. Фразу даволі лёгка вылучыць у музычнай мове. Яна заўсёды спяваецца на адным дыханні. Некалькі фраз утвараюць музычны **сказ** — завершаную музычную думку.

Звычайна мы лёгка адрозніваем на слых элементы музычнай мовы. Нават калі твор выконваецца не голасам, а на музычным інструменце, мы адчуваем «дыханне» паміж фразамі. Добра адчуваецца і завершанасць думкі ў музычным сказе.

## Кума мая, кумачка

Беларуская народная песня

Апрацоўка В. Сярых






Правообладатель Пачатковая школа




1. Вызначце ў нотным запісе элементы музычнай мовы. Колькі атрымалася фраз? Колькі сказаў? Ці ёсць сярод іх падобныя?
2. Пры спевах мы звычайна бяром дыханне паміж фразамі. Запішыце мелодыю песні ў сшытку. Падзяліце яе на фразы. Пастаўце знакі дыхання (V).

## Пад калінаю, пад малінаю

Беларуская народная песня

Інструментоўка А. Аляхновіча






Правообладатель Пачатковая школа



1. Знайдзіце ў музыцы паўторы.
2. Падбярыце для выканання музычныя інструменты. Якія з іх найбольш адпавядаюць характару музыкі?
3. Выкарыстайце знаёмыя вам спосабы выканальніцкага развіцця, каб упрыгожыць твор.

Калі замаляваць рух мелодыі ў музычнай фразе альбо сказе, можна заўважыць, што лінія пастунова рухаецца ўверх. Яна плаўна падымаецца і дасягае сваёй вяршыні. Гэта найвышэйшы пункт яе развіцця, які называецца **кульмінацыяй**. У нотным запісе яе лёгка пазнаць па найбольш высокім гуку.

 

## Прэлюдыя № 7

Музыка Ф. Шапэна

1. Услухайцеся ў музыку твора. Кампазітар называў яго «балерына, якая танцуе». Як вы лічыце чаму?



Правообладатель Пачатковая школа

2. Якія спосабы музычнага развіцця выкарыстаў кампазітар?

3. Вызначце ў творы фразы. Адлюструйце іх пластычнымі рухамі рук. Сачыце, каб характар рухаў адпавядаў характару музыкі.

4. Знайдзіце кульмінацыю ў творы. Перадайце меладыйны малюнак выразнымі рухамі рук.

## ЯК МУЗЫКА РАСПАВЯДАЕ ГІСТОРЫІ, У ЯКІХ НЯМА КАНТРАСТАЎ

У некаторых музычных творах няма кантрастаў. Каб засяродзіць увагу слухача на пэўных пачуццях чалавека альбо стане прыроды, кампазітары захоўваюць адзін настрой на працягу ўсяго гучання музыкі. Распавядаючы музычныя гісторыі, у якіх няма кантрастаў, кампазітары шырока ўжываюць мелaдыйнае, тэмпавае, рэгістравае і тэмбравае развіццё.

Плавала воблака
ў чыстай сінечы,
лёгкія хмаркі
брала на плечы,
з імі яно
карагоды вадзіла,
дождж пасылала,
каб жыта радзіла.
Ведала воблака
травы і кветкі,
рэкі, азёры,
пушчы, палеткі.

*А. Дзеружынскі*



Правообладатель Пачатковая школа



**Аляксандр Фёдаравіч Літвіноўскі**
(нарадзіўся ў 1962 г.)

**Аляксандр Літвіноўскі** — сучасны беларускі кампазітар, аўтар твораў для розных інструментаў. А. Літвіноўскі выкарыстоўвае сродкі электроннай музыкі, што надае яго творам асаблівую выразнасць.

## Вячэрнія аблокі

Музыка А. Літвіноўскага



У творы «Вячэрнія аблокі» кампазітар не толькі намаляваў цудоўныя вобразы родных краявідаў, але і адлюстраваў свае трапяткія пачуцці да іх.


Правообладатель Пачатковая школа

1. Пры дапамозе якіх сродкаў выразнасці кампазітар стварае музычную карціну?
2. Прасачыце за тым, як музыка дасягае кульмінацыі ў сваім развіцці.
3. Зрабіце ілюстрацыю да твора. Якія колеры вам спатрэбяцца?

## Прятки

Словы А. Кушнера

Музыка А. Думчанкі








Правообладатель Пачатковая школа






Правообладатель Пачатковая школа




1. Вызначце на слых элементы музычнай мовы.
2. Як вы лічыце, чаму кампазітар аддзяліў фразы адну ад адной паўзамі?
3. Для чаго кампазітар выкарыстаў паўторы? Знайдзіце паўторы ў нотным запісе. Ці дакладныя яны?
4. Для больш выразнага выканання песні стварыце выканальніцкі план.

## ДВУХЧАСТКАВАЯ ФОРМА

Двухчасткавая кантрасная форма найчасцей ужываецца ў вакальнай музыцы. З ёй вы ўжо сустракаліся


Правообладатель Пачатковая школа

падчас выканання песень. Гэтая форма складаецца з дзвюх частак. Адна з іх — **запеў**, а другая — **прыпеў.** Вершаваны тэкст звычайна аб'ядноўвае кантрасныя часткі ў адно цэлае — **куплет.**



## Доброта

Словы Н. Тулупавай — Музыка І. Лучанка






Правообладатель Пачатковая школа




2. Добрым быть совсем, совсем не просто.
Не зависит доброта от роста.
Доброта приносит людям радость
и взамен не требует награды.
**Прыпеў.**

3. Доброта с годами не стареет,
доброта от холода согреет.
Если доброта, как солнце, светит,
радуются взрослые и дети.
**Прыпеў.**

**1.** Колькі частак у гэтай песні? Як яны называюцца?



Правообладатель Пачатковая школа

2. Які характар музычнай мовы ў кожнай частцы? Якія кантрасныя сродкі музычнай выразнасці вы заўважылі?
3. Абазначце будову твора пры дапамозе картак з каляровай паперы. Падобныя ці кантрасныя колеры вы выкарысталі?
4. Якія песні пра дабрыню і сяброўства вам яшчэ знаёмы? Прыгадайце іх.

Вы ўжо ведаеце, што бываюць песні без слоў: вам знаёма «Старадаўняя французская песенька» з «Дзіцячага альбома» П. Чайкоўскага. «Італьянская песенька» — яшчэ адзін твор з гэтага цыкла фартэпіянных п’ес.




## Італьянская песенька

*(з «Дзіцячага альбома»)*

Музыка П. Чайкоўскага

**Фрагмент 1**




**Фрагмент 2**






Правообладатель Пачатковая школа

1. Музыка гэтага твора складаецца з дзвюх кантрасных частак. Як вы лічыце, чаму кампазітар выкарыстаў менавіта такую музычную форму?
2. Прасачыце па нотных фрагментах за развіццём музычнай думкі кампазітара. Ці рэзка адрозніваюцца паміж сабой дзве музычныя фразы?
3. Што, на ваш погляд, аб'ядноўвае часткі твора ў адно цэлае?
4. Адлюструйце гучанне музыкі з дапамогай выразных пластычных рухаў.

## Июльская ночь

В три часа запевает ранняя птица.
А песенке птичьей пока ещё спится.
Песенку ночь укачает, остудит.
А птица её согревает и будит.

*Э. Штрытматэр (пераклад І. Такмаковай)*

1. Знайдзіце ў вершы кантрасты. Падбярыце тэмп, сілу гуку і тэмбр для кожнага радка.
2. Уявіце, як будзе гучаць ваш уласны музычны твор «Июльская ночь» на словы Эрвіна Штрытматэра.


Правообладатель Пачатковая школа

## ТРОХЧАСТКАВАЯ ФОРМА

Спалучэнне кантрасту і паўтору дапамагае стварыць трохчасткавую форму — адну з найбольш распаўсюджаных у музыцы. Кантрасная сярэдзіна дазваляе перадаць новыя рысы музычнага вобраза, а вяртанне да ўжо знаёмай мелодыі дапамагае падкрэсліць галоўнае ў творы.



Трохчасткавая форма можа быць уласціва і вершам.

### Где спит рыбка?

Ночью темень. Ночью тишь.
Рыбка, рыбка, где ты спишь?
Лисий след ведёт к норе,
след собачий — к конуре.
Белкин след ведёт к дуплу,
мышкин — к дырочке в полу.
Жаль, что в речке, на воде,
нет следов твоих нигде.
Только темень, только тишь.
Рыбка, рыбка, где ты спишь?

*І. Такмакова*


Правообладатель Пачатковая школа

1. Абазначце часткі верша пры дапамозе картак з каляровай паперы. Колькі картак вам спатрэбілася?
2. Як вы лічыце, чаму паэтка выкарыстала менавіта трохчасткавую форму?

У музыцы рэпрыза можа ўжывацца і для абазначэння паўтору часткі музычнага твора.

## Весёлые медвежатки

Словы Н. Пікулёвай Музыка А. Паплянавай








*З пачатку да слова «канец»*

1. Прасачыце за тым, як кампазітар развівае музыку.
2. Адлюструйце будову твора пры дапамозе картак з каляровай паперы. Колькі частак у вас атрымалася? Ці ёсць сярод іх падобныя?
3. Ахарактарызуйце музыку сярэдняй часткі твора. Якія кантрасты выкарыстаў кампазітар? Дзеля чаго, на ваш погляд, ён ужыў паўторы?



## Баба-Яга

*(з «Дзіцячага альбома»)*

Музыка П. Чайкоўскага








1. Як у музыцы ўвасабляецца традыцыйны персанаж рускіх народных казак? Якія рысы характару Бабы Ягі адлюстраваны ў творы? Як вы лічыце, ці аднолькавыя сродкі музычнай выразнасці патрэбны для ўвасаблення ў музыцы дабра і зла?
2. Прасачыце па нотным запісе за рухам мелодыі. Вызначце, ці ёсць у мелодыі скачкі і акцэнты. Для чаго кампазітар іх выкарыстаў?
3. Адлюструйце будову твора пры дапамозе картак з каляровай паперы. Колькі картак вам спатрэбілася? Ці аднолькавымі па памеры павінны быць карткі для першай і апошняй частак твора?
4. Чаму кампазітар выкарыстаў няпоўныя паўторы? Што вы ўяўляеце, слухаючы музыку?
5. Прыдумайце да твора казачны сюжэт.

## РОНДА

Адна з найбольш цікавых музычных форм — **ронда.** Слова «ронда» ў перакладзе з французскай мовы значыць «карагод», «хадзіць па крузе».

У музычных творах у форме ронда заўсёды ёсць мелодыя, якая нязменна паўтараецца не менш за тры разы. Такая мелодыя называецца **рэфрэнам.** Звычайна ронда пачынаецца з рэфрэну і завяршаецца ім. Узнікае ўражанне, быццам музыка ўтварае замкнёнае кола.

Рэфрэн чаргуецца з іншымі мелодыямі — **эпізодамі,** якія звычайна вылучаюцца розным характарам.



### Болтунья

Словы А. Барто

Музыка С. Пракоф’ева



1. Якія рысы характару дзяўчынкі імкнуўся адлюстраваць кампазітар? Як вы думаеце, чаму аўтар выкарыстаў менавіта форму рондо?
2. Адлюструйце будову твора пры дапамозе картак з каляровай паперы. Колькі картак вам спатрэбілася? Ці ёсць сярод іх аднолькавыя?
3. Колькі разоў у творы гучыць рэфрэн? Колькі ў творы эпізодаў?

## Зачем нам выстроили дом?

Словы В. Віктарава — Музыка Д. Кабалеўскага

Град и стужа за окном,
дождь и лужа за окном.
Мяч футбольный за окном,
ветер вольный за окном.
Зачем, зачем нам выстроили дом?
Чтоб всё, чтоб всё осталось за окном?
Град и стужа за окном,
дождь и лужа за окном.
Мяч футбольный за окном,
ветер вольный за окном.
А мама спокойна — всё за окном.
Вот для чего нам построили дом!

Град и стужа...
Дождь и лужа...
Мяч футбольный...
Ветер вольный...
Вот для чего нам построили дом!

1. Чаму кампазітар выкарыстаў форму ронда? Як гэта звязана са зместам песні?
2. Каб выканаць твор у форме ронда, вам спатрэбіцца больш складаны выканальніцкі план. Падбярыце выканальніцкія сродкі для рэфрэну і кожнага з эпізодаў. Запішыце выканальніцкі план на дошцы альбо ў сшытку.
3. Выканайце песню.

## ВАРЫЯЦЫІ

**Варыяцыі** — гэта музычная форма, дзе асноўная мелодыя падаецца са змяненнямі. Традыцыя варыяцый паходзіць з народнай творчасці. Падчас выканання народных песень куплеты часта паўтараліся. Пры гэтым змянялася іх мелодыя.

## На лугу, на лугу зелянёшанькім

Беларуская народная песня

Апрацоўка А. Аляхновіча











1. Пра што распавядае песня? Паразважайце, чаму кожнаму трэба з пашанай і адказнасцю ставіцца да прыроды і яе багаццяў.
2. Прасачыце за змяненнямі мелодыі. Што змяняецца ў музыцы кожнага куплета? Як гэтыя змяненні звязаны са зместам песні?
3. Паспрабуйце стварыць уласны варыянт мелодыі. Выкарыстайце змяненні вышыні гуку, рытму, ладу. Запішыце мелодыю ў сшытку альбо на дошцы.

У сваёй творчасці кампазітары часта выкарыстоўваюць варыяцыі. Найбольш распаўсюджана гэта форма ў інструментальнай музыцы.

## Камарынская

Руская народная танцавальная

**Жвава**




1. Прасачыце па нотным запісе і вызначце, колькі музычных фраз у гэтым фрагменце. Розныя яны ці аднолькавыя?
2. Падчас паўторнага слухання прасачыце, як змяняецца музыка.

## Камарынская

*(з «Дзіцячага альбома»)*

Музыка П. Чайкоўскага

**Хутка**





1. Ахарактарызуйце асноўную мелодыю твора.
2. Прасачыце за развіццём музыкі. Як яна змяняецца на працягу твора? Якія спосабы музычнага развіцця выкарыстаў кампазітар?
3. Што надае музыцы змяненне тэмбру? Чаму, на ваш погляд, кампазітар выкарыстаў гэты прыём?
4. Прасачыце за рухам мелодыі па нотным запісе. Вызначце, колькі музычных фраз у гэтым фрагменце. Параўнайце іх.
5. Параўнайце гэты фрагмент з фрагментам рускай народнай танцавальнай «Камарынская». Чым падобны творы, а чым адрозніваюцца?

## АБАГУЛЬНЕННЕ ТЭМЫ ЧАЦВЁРТАЙ ЧВЭРЦІ

1. Як жыццёвыя кантрасты ўвасабляюцца ў музыцы? Як яны ўплываюць на яе будову?
2. Для чаго ў музыцы выкарыстоўваюцца паўторы? Якую ролю яны адыгрываюць у развіцці музыкі? Як абазначаюцца паўторы ў нотным запісе?
3. У музыцы ёсць фразы і сказы. Што дапамагае вылучаць на слых элементы музычнай мовы?
4. Прыгадайце розныя музычныя формы. Прывядзіце прыклады твораў, пабудаваных у двухчасткавай і трохчасткавай форме.
5. Ад якога слова атрымала сваю назву музычная форма рондо? Прывядзіце прыклады твораў, напісаных у гэтай форме.
6. Адкуль паходзіць музычная форма варыяцыі? Чым яна вылучаецца? Ці ёсць у ёй кантрасты і паўторы?
7. Як кампазітар стварае музыку? Раскажыце пра свой уласны творчы вопыт.
8. На ўроках гучала музыка беларускіх і замежных кампазітараў. Якія з іх твораў вам найбольш спадабаліся? Адбярыце творы для сваёй музычнай калекцыі.

**Да новых сустрэч з музыкай!**

# СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Андреева, М. Дождик песенку поёт : песни и пьесы для детей мл. возраста / М. Андреева. — М. : Музыка, 1981. — 56 с.
2. Антология советской детской песни [Ноты] : песни для детей мл. шк. возраста. — Вып. 2 / сост. Е. В. Николаева, М. В. Борисова. — М. : Музыка, 1987. — 158 с.
3. Безенсон, А. Гадзіннік : харавыя тв. для дзяцей / А. Безенсон. — Мінск : Каўчэг, 2016. — 48 с.
4. Бейдер, Т. Музыка в школе : 3-й кл. : пособие для учителя / Т. Бейдер, Л. Левандовская. — М. : Музыка, 1977. — 84 с.
5. Весёлая карусель : песни из мультфильмов, телеспектаклей и радиопередач для детей : [пение (соло, хор) в сопровожд. фп.]. — Вып. 4. — М. : Музыка, 1981. — 24 с.
6. Глебаў, Я. Запрашэнне ў краіну маленства [Ноты] : араторыя : [для дзіцячага хору, салістаў і сімф. аркестра] / Я. Глебаў ; тэкст П. Макаля. — Мінск : Беларусь, 1981. — 86 с.
7. Глинка, М. Арагонская хота ; Воспоминания о летней ночи в Мадриде ; Камаринская [Ноты] / перелож. для фп. Е. Веврика, С. Ляпунова. — Л. : Музыка, Л. отд-ние, 1983. — 40 с.
8. Давыдова, Е. Музыкальная грамота : учеб. пособие для дет. муз. шк. / Е. Давыдова, С. Запорожец. — М. : Гос. муз. изд-во, 1958. — 176 с.
9. Даньшова, А. Песни для детей [Ноты] : [для голоса (хора) в сопровожд. фп.] / А. Даньшова. — Минск : [б. и.], 2009. — 56 с.
10. Жигалко, Е. Музыка, фантазия, игра : учеб. пособие по ритмике, сольфеджио, слушанию музыки для детей 5–8 лет / Е. Жигалко, Е. Казанская. — СПб. : Композитор, 1999. — 40 с.
11. З французскай і бельгійскай паэзіі / пер. з фр. і камент. Э. Агняцвет. — Мінск : Маст. літ., 1993. — 82 с.
12. Лучанок, І. Цягнік дзяцінства : 36 песень : [для голасу або хору з фп.] / І. Лучанок. — Мінск : БелІПК, 1997. — 64 с.
13. Люблю наш край : харавыя тв. беларус. кампазітараў : [для дзіцячага хору ў суправадж. фп. і без суправадж.] : дапам. для настаўнікаў / уклад. В. І. Карэтнікаў, В. І. Дабравольская ; пад рэд. В. І. Карэтнікава. — Мінск : Беларусь, 1998. — 126 с.

14. Лясны карагод : вершы, загадкі, песні пра звяроў : [для голасу і фп.] / уклад. І. В. Гнеўка, В. М. Лучанок, Л. Р. Рэцкая. — Мінск : Беларусь, 1998. — 88 с.
15. Металлиди, Ж. Про луну и апельсины : песни для дет. хора / Ж. Металлиди. — СПб. : Композитор, 1997. — 36 с.
16. Музыка : нот. хрест. : 3-й кл. / сост. Е. Г. Гуляева, М. Б. Горбунова, И. В. Ящембская-Колёса. — Минск : Адукацыя і выхаванне, 2013. — 184 с.
17. От стихов — к музыке : Ритмическая декламация, движение и словотворчество на уроках музыки : хрест. / сост. Е. В. Жигалко. — СПб. : Композитор, 1999. — 80 с.
18. Поплянова, Е. А мы на уроке — играем! : муз. игры, игровые песни : [для голоса в сопровожд. фп.] / Е. Поплянова. — М. : Новая школа, 1994. — 72 с.
19. Пресленёв, А. Разноцветье : песни для детей мл. и сред. шк. возраста : [для голоса в сопровожд. фп.] / А. Пресленёв. — М. : Сов. композитор, 1987. — 54 с.
20. Произведения для детского хора : хрест. / сост. И. И. Москалькова. — Л. : Музыка, Л. отд-ние, 1983. — 72 с.
21. Струве, Г. Ступеньки музыкальной грамотности : хоровое сольфеджио. — СПб. : Лань, 1997. — 64 с. — (Учебники для вузов. Специальная литература).
22. Токмакова, И. Где спит рыбка? : стихи и истории для малышей / И. Токмакова. — М. : Махаон, 2015. — 96 с.
23. Усачёва, В. Музыкальное искусство : учеб. для учащихся 4-го кл. общеобразоват. учреждений / В. Усачёва, Л. Школяр. — М. : Вентана-Граф, 2004. — 128 с.
24. Хармс, Д. Весёлый старичок : стихи / Д. Хармс. — М. : Махаон, 2010. — 32 с.
25. Хорунжий, А. Давня французька пісенька : оповідання / А. Хорунжий. — К. : Дніпро, 1981. — 304 с.
26. Хрэстаматыя па спевах : I–III кл. / уклад. У. Д. Каструлёў, А. А. Філіповіч. — Мінск : Нар. асвета, 1977. — 416 с.
27. Цітовіч, Г. Добры вечар [Ноты] : [для хароў розных складоў у суправадж. баяна і без суправадж.] / Г. Цітовіч. — Мінск : Беларусь, 1986. — 64 с.
28. Школьны спеўнік / уклад. Р. Шырма. — Мінск : Дзярж. вучэб.-пед. выд-ва М-ва асветы БССР, 1957. — 198 с.
29. Юркевич, В. Искусство : нот. хрест. для подготов. кл. : пособие для учителей / В. Юркевич. — Минск : Лимариус, 2001. — 192 с.

# ЗМЕСТ

**Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь.**
*Словы М. Клімковіча, У. Карызны,*
*музыка Н. Сакалоўскага* .................................... 5

## ПЕСЕННЫ, ТАНЦАВАЛЬНЫ І МАРШАВЫ ХАРАКТАР МУЗЫЧНАЙ МОВЫ

**Песенны, танцавальны і маршавы характар**
**музычнай мовы** ................................................. **8**
Во поле берёза стояла. *Руская народная песня* .... 8
Полька (з «Дзіцячага альбома»).
*Музыка П. Чайкоўскага* ......................................... 9
Марш драўляных салдацікаў (з «Дзіцячага альбома»). *Музыка П. Чайкоўскага* ........................ 9
Адажыа Маленькага прынца і Ружы (з балета «Маленькі прынц»). *Музыка Я. Глебава* .................11
Тэма Болтушкі (з оперы «Воўк і сямёра казлянят»). *Словы Я. Манучаравай,*
*музыка М. Каваля* .............................................11
Пеця (з сімфанічнай казкі «Пеця і воўк»).
*Музыка С. Пракоф'ева* ........................................11
Жывіца. *Словы Т. Мушынскай,*
*музыка А. Безенсон* ............................................12

**Песенны характар музычнай мовы ........................ 15**

Дуб. *Я. Купала* ............................................... 15
Дуб. *Словы Я. Купалы, музыка А. Чыркуна* .......... 17
Правінцыяльная сімфонія (урывак з 3-й часткі).
*Музыка Д. Лыбіна* ........................................... 21

**Песеннасць у інструментальнай музыцы ..............22**

Старадаўняя французская песенька
(з «Дзіцячага альбома»). *Музыка*
*П. Чайкоўскага* ..............................................23
Дуэт Машы і Прынца (з балета «Шчаўкунок»).
*Музыка П. Чайкоўскага* .................................26

**Танцавальны характар музычнай мовы ..................27**

Тра-ля-ля-ля-ля. *М. Карэм*
*(пераклад Э. Агняцвет)* ....................................27
Мікіта. *Беларуская народная песня-танец* ............28
Заўжды ляці (з араторыі «Запрашэнне ў краіну
маленства»). *Словы П. Макаля, музыка Я. Глебава* ....30

**Танцавальнасць у вакальнай і інструментальнай**
**музыцы ....................................................... 31**

Лесной праздник. *Словы А. Фаткіна,*
*музыка Ж. Металідзі* ....................................... 31
Папяровая балерына. *Музыка Г. Гарэлавай* ..........33
Арагонская хота. *Музыка М. Глінкі* .....................36

**Маршавы характар музычнай мовы .......................37**

Ёжик и барабан. *Г. Віеру (пераклад Я. Акіма)* .....38
Крокі. *Музыка Г. Вагнера* ......................................40
Песенка слонёнка о самом себе.
*Словы А. Зарубіна, музыка А. Даньшовай* ...........42

**Маршавасць у вакальнай і інструментальнай музыцы ..........................................................................45**

Песенька Каваля (з оперы «Адчыніце, казляняткі»). *Словы П. Макаля, музыка А. Залётнева* ...........................................46
Паланэз. *Музыка Ф. Шапэна* .................................49
Першая інтэрмедыя (з араторыі «Запрашэнне ў краіну маленства»). *Музыка Я. Глебава* ..............50

**Абагульненне тэмы першай чвэрці ......................... 51**

## ІНТАНАЦЫЯ

**Выразнасць слова, гуку, руху ................................52**

Разговор с пчелой. *М. Барадзіцкая* .......................52
Палёт чмяля (з оперы «Казка пра цара Салтана»).
*Музыка М. Рымскага-Корсакава* ............................53
Акіян-мора сіняе (уступ да оперы «Садко»).
*Музыка М. Рымскага-Корсакава* ............................55

**Блізкасць маўленчай і музычнай інтанацыі ..........56**
Як пагнала бабуленька куранятак пасці.
*Беларуская народная песня* ..................................57
Няньчына казка (з «Дзіцячага альбома»).
*Музыка П. Чайкоўскага* .........................................60

**Зерне-інтанацыя ......................................................61**
Сеў жучок на сучок. *Беларуская народная песня* ..........................................................................62
Восеньскі малюнак. *Музыка Я. Паплаўскай* ..........63

**Выразная інтанацыя ...............................................63**
Радосць. *М. Карэм (пераклад В. Берастава)* .........64
Весёлая песенка. *Словы В. Віктарава, музыка Г. Струвэ* .............................................................65
Грустная песенка. *Словы В. Віктарава, музыка Г. Струвэ* .............................................................67
Песня Сольвейг (з музыкі да драмы Г. Ібсэна «Пэр Гюнт»). *Пераклад М. Слонава, музыка Э. Грыга* ..............................................................70

**Выяўленчая інтанацыя ........................................ 71**
Зязюля. *Швейцарская народная песня (пераклад І. Хвораста)* ......................................... 71
Сімфонія № 101 «Гадзіннік» (урывак з 2-й часткі).
*Музыка І. Гайдна* ......................................................74
Гадзіннік. *Музыка У. Кур’яна* ...................................75

**Выразная і выяўленчая інтанацыі сустракаюцца ў адным творы ............ 76**

Зіма. *Словы Я. Баратынскага, музыка Ц. Кюі* ...... 76
Зіма. *Словы Я. Коласа, музыка І. Лучанка* ............ 77
Мароз. *Я. Купала* ............ 79
У зімовым лесе (з сюіты «Поры года»). *Музыка В. Карэтнікава* ............ 81
Новы год. *М. Чарняўскі* ............ 81
Навагодні карагод. *Словы В. Лучанок, музыка І. Лучанка* ............ 82
Вальс каля навагодняй ёлкі (з сюіты «Поры года»). *Музыка В. Карэтнікава* ............ 84

**Абагульненне тэмы другой чвэрці ............ 85**

## РАЗВІЦЦЁ МУЗЫКІ

**Як расказваюць і слухаюць музычныя гісторыі ....86**

Канцэрт для скрыпкі з аркестрам «Зіма» (частка 1) (з цыкла «Поры года»). *Музыка А. Вівальдзі* ........ 87
Почему медведь зимой спит. *Словы А. Каваленкава, музыка Л. Кніпера* ........... 88

**Як развівае музыку кампазітар ............ 89**

Снежны гарадок (з сюіты «Поры года»). *Музыка В. Карэтнікава* ............ 89

Снегопад. *Словы Э. Фарджан (пераклад М. Барадзіцкай), музыка Ж. Металідзі* ..................90

**Развіццё мелоды ............................................92**

Песенка солнечных зайчиков. *Словы Ф. Лаўбэ, музыка В. Казеніна* ..........................................92

Варона на слізкім даху. *Музыка Г. Гарэлавай* ......94

**Дынамічнае развіццё музыкі ..............................95**

Была тишина. *А. Шыбаеў* ...................................95

Раніца (з музыкі да драмы Г. Ібсэна «Пэр Гюнт»). *Музыка Э. Грыга* ............................................97

**Тэмпавае развіццё музыкі ..................................98**

Как под мельницей. *Словы народныя, музыка М. Андрэевай* .......................................98

Поезд. *Словы Т. Сікорскай, музыка М. Мятлова* ...99

У пячоры горнага караля (з музыкі да драмы Г. Ібсэна «Пэр Гюнт»). *Музыка Э. Грыга* ............. 100

**Тэмбравае і рэгістравае развіццё музыкі .............101**

Вясельны дзень у Трольхаўгене. *Музыка Э. Грыга* ...........................................101

Медведь и комар. *Словы В. Шуміліна, музыка А. Праслянёва* ................................. 102

Фантазія на тэму беларускай народнай песні «Перапёлачка». *Музыка Я. Глебава* ..................... 104

**Ладавае развіццё музыкі ..................................... 105**
Вальс. *Музыка Ф. Шуберта* .................................. 106
Смоўж. *Х. Жычка* .................................................. 106
Улітка. *Словы С. Сяровай, музыка В. Кікты* ........107
Тучка. *В. Берастаў* ................................................ 109
**Майстэрства выканаўцы ......................................110**
Как сделать утро волшебным. *А. Дрыз (пераклад Р. Сефа)* ............................................111
Самая лепшая. *Словы У. Карызны, музыка С. Хвашчынскага* ................................112
Тень-тень, потетень. *Словы народныя, музыка В. Калліннікава* ......................................114
**Музычныя дыялогі ................................................116**
Вясна-красна. *Беларуская народная песня* .......... 117
Сороконожки. *Словы У. Арлова, музыка А. Даньшовай* ........................................118
**Абагульненне тэмы трэцяй чвэрці .........................121**

## БУДОВА (ФОРМЫ) МУЗЫКІ

**Разнастайнасць будовы музычных твораў ........... 122**
Прекрасен мир поющий. *Словы В. Сцяпанава, музыка Л. Абелян* .................................................. 122
**Кантрасты і паўторы ў жыцці і ў музыцы ........... 126**
У Белого моря. *Р. Заслаўскі* ................................. 126

Цёплыя дзянёчкі. *Словы Л. Пранчака, музыка М. Літвіна* ........ 128
Карагодны. *Беларускі народны танец. Апрацоўка М. Чуркіна* ........ 129
А мы грушу пасадзілі. *Беларуская народная песня. Апрацоўка А. Рашчынскага* ........ 130

**З чаго складаецца музычная мова ........ 131**

Кума мая, кумачка. *Беларуская народная песня. Апрацоўка В. Сярых* ........ 132
Пад калінаю, пад малінаю. *Беларуская народная песня. Інструментоўка А. Аляхновіча* ........ 133
Прэлюдыя № 7. *Музыка Ф. Шапэна* ........ 134

**Як музыка распавядае гісторыі, у якіх няма кантрастаў ........ 135**

«Плавала воблака...» *А. Дзеружынскі* ........ 135
Вячэрнія аблокі. *Музыка А. Літвіноўскага* ........ 136
Прятки. *Словы А. Кушнера, музыка А. Думчанкі* ........ 137

**Двухчасткавая форма ........ 139**

Доброта. *Словы Н. Тулупавай, музыка І. Лучанка* ........ 140
Італьянская песенька (з «Дзіцячага альбома»). *Музыка П. Чайкоўскага* ........ 142

Июльская ночь. *Э. Штрытматэр (пераклад І. Такмаковай)* ........ 143

**Трохчасткавая форма ........ 144**

Где спит рыбка? *І. Такмакова* ........ 144
Весёлые медвежатки. *Словы Н. Пікулёвай, музыка А. Паплянавай* ........ 145
Баба-Яга (з «Дзіцячага альбома»). *Музыка П. Чайкоўскага* ........147

**Ронда ........ 149**

Болтунья. *Словы А. Барто, музыка С. Пракоф'ева* ........ 149
Зачем нам выстроили дом? *Словы В. Віктарава, музыка Д. Кабалеўскага* ........ 150

**Варыяцыі ........151**

На лугу, на лугу зелянёшанькім. *Беларуская народная песня. Апрацоўка А. Аляхновіча* ........ 152
Камарынская. *Руская народная танцавальная* .... 154
Камарынская (з «Дзіцячага альбома»). *Музыка П. Чайкоўскага* ........ 154

**Абагульненне тэмы чацвёртай чвэрці ........ 156**

Спіс выкарыстаных крыніц ........157

(Назва і нумар установы адукацыі)

| Навучальны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |

Вучэбнае выданне

**ГУЛЯЕВА** Алена Рыгораўна
**ГАРБУНОВА** Марыя Барысаўна
**ЯШЧЭМБСКАЯ-КАЛЁСА** Ірына Вячаславаўна

**МУЗЫКА**

Вучэбны дапаможнік для 3 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання

Для работы ў класе

Рэдактар *А. І. Левіціна.* Мастак *В. В. Архіпенка.*
Нотаграфік *В. А. Дземідовіч.* Дызайн вокладкі *М. А. Аніськавай.*
Дызайн і вёрстка *А. А. Ракавай.* Карэктар *Т. В. Басалыга*

Падпісана ў друк 14.04.2017. Фармат 70×90 1/16. Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 12,29. Ул.-выд. арк. 6,5. Тыраж 9350 экз. Заказ 1197.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва “Пачатковая школа”».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/50 ад 08.10.2013.
Вул. Фабрыцыуса, 5, каб. 201, 220007, г. Мінск. Тэл./факс 233-99-34.
www.p-shkola.by; e-mail: psh@p-shkola.by

Адкрытае акцыянернае таварыства «Паліграфкамбінат ім. Я. Коласа».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка
друкаваных выданняў № 2/3 ад 04.10.2013. Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, г. Мінск.

ISBN 978-985-565-369-2